С. І. Шэйпа, Г. М. Разанава

ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАВАНАСЦЬ

# ШЧАСЛІВЫ БЕЛАРУСАМ ЗВАЦЦА

## 5–9 класы

## МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

С. І. Шэйпа, Г. М. Разанава

ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАВАНАСЦЬ

# ШЧАСЛІВЫ БЕЛАРУСАМ ЗВАЦЦА

## 5–9 класы

## МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Дапаможнік для настаўнікаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання**

*Рэкамендавана навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Вучэбнае электроннае выданне

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
2023

УДК 373.5.016:[39+008]
ББК 74.266.35

Р э ц э н з е н т ы:

старшы выкладчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук *М. А. Шатарава*;

раённае метадычнае аб'яднанне настаўнікаў мастацтва (настаўнік мастацтва вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 8 г. Слоніма» *Н. В. Лашчэўская*)

Дадзены дапаможнік уваходзіць у вучэбна-метадычны комплекс па фарміраванні функцыянальнай адукаванасці «Шчаслівы беларусам звацца», 5–9 класы.

Вучэбна-метадычны комплекс факультатыўных заняткаў распрацаваны ў Нацыянальным інстытуце адукацыі ў межах выканання задання ГНТП «Функцыянальная адукаванасць» і ўключаны ў зводны план выпуску (укаранення) зноў асвоенай прадукцыі (інавацый) па ГНТП «Функцыянальная адукаванасць» на 2021–2025 гг., зацверджаны Міністэрствам адукацыі ад 17.02.2021. Мова выдання — беларуская.

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Н. М. Мамчыц*
Камп'ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейка*

Падпісана да карыстання 2023
Размешчана на сайце 2023

Аб'ем выдання 2218 КБ
Сістэмныя патрабаванні: ПЗ для прагляду дакументаў у фармаце pdf

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014.
Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

**ISBN 978-985-893-558-0**

© Шэйпа С. І., Разанава Г. М., 2023
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2023

# Змест

Уводзіны ........ 5

УВОДЗІНЫ Ў ПРАЕКТНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ ........ 9

МОДУЛЬ 1. СВАЯ ХАТКА — ЯК РОДНАЯ МАТКА ........ 10

МОДУЛЬ 2. НАШУ ДАЧКУ ПАЗНАЮЦЬ І Ў АНДАРАЧКУ ........ 15

МОДУЛЬ 3. ШТО ХУТАРОК — ТО ГАВАРОК, ШТО СЯЛЬЦО — ТО СЛАЎЦО ........ 20

МОДУЛЬ 4. СМАЧНА БЫЛО, ДЫ БЛІЗКА ДНО ........ 24

МОДУЛЬ 5. НА ЎСЁ СВАЕ ПЕСНІ: НА ВЯСЕЛЛІ ВЯСЕЛЬНЫЯ, А НА ХРЫСЦІНАХ ХРЫСЦІННЫЯ ........ 28

МОДУЛЬ 6. ДОБРАЯ ДАРОГА — КАРАЦЕЙШЫ ШЛЯХ ........ 33

МОДУЛЬ 7. ДОБРАЯ СЛАВА ДАЛЁКА ЧУВАЦЬ ........ 39

МОДУЛЬ 8. ЧАЛАВЕК ЖЫВЕ ВЕК, А ДОБРАЕ ДЗЕЛА — ДВА ........ 43

МОДУЛЬ 9. НА ДОБРАЙ ЗЯМЛІ ДОБРАЯ НАДЗЕЯ ........ 47

*Спіс выкарыстаных крыніц* ........ 53

*Спіс малюнкаў* ........ 54

# УВОДЗІНЫ

Вучэбна-метадычны комплекс (далей — ВМК) факультатыўных заняткаў «Шчаслівы беларусам звацца» арыентаваны на фарміраванне асобы, здольнай адэкватна ўспрымаць і ацэньваць дасягненні духоўнай і матэрыяльнай культуры, гатовай да дзейнасці па законах дабра, сумлення, гонару, справядлівасці, патрыятызму, грамадзянскага абавязку.

ВМК уключае: вучэбную праграму, дыдактычныя матэрыялы, метадычныя рэкамендацыі. Галоўная асаблівасць прапанаванага ВМК заключаецца ў тым, што ён арыентаваны на творчае ўзаемадзеянне настаўніка і вучняў у працэсе сумеснай работы над праектамі.

ВМК прызначаны для арганізацыі і правядзення факультатыўных заняткаў для вучняў V–IX класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі (2 гады навучання). Магчыма арганізацыя факультатыўных заняткаў у рознаўзроставых групах.

Змест вучэбнага матэрыялу структураваны ў 9 модуляў, кожны з якіх уключае асобныя тэмы. У рамках кожнага модуля прапанаваны прыкладныя тэмы кароткатэрміновых праектаў. Колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне вучэбнага матэрыялу адпаведнай тэмы з'яўляецца прыкладнай і залежыць ад відаў дзейнасці, якія арганізуе настаўнік, а таксама ад вучэбна-пазнавальных магчымасцей вучняў. Настаўнік мае права пераразмяркоўваць колькасць гадзін на вывучэнне тэм з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей, асабістага вопыту вучняў.

***Узаемадзеянне настаўніка і вучня пры рабоце над праектам***

Роля настаўніка пры выкананні праектаў змяняецца ў залежнасці ад этапаў работы над праектам. Аднак на ўсіх этапах педагог выступае як фасілітатар, памочнік. Ён не перадае веды, а забяспечвае дзейнасць вучня, гэта значыць:

- кансультуе. Настаўнік ініцыіруе пытанні, разважанні, самастойную ацэнку дзейнасці, мадэлюючы розныя сітуацыі, трансфармуючы адукацыйнае асяроддзе і г. д.;
- матывуе. Падчас работы настаўнік павінен прытрымлівацца прынцыпаў, якія раскрываюць перад вучнямі сітуацыю праектнай дзейнасці як сітуацыю выбару і свабоды самавызначэння;
- фасілітуе. Задача настаўніка заключаецца не ў перадачы вучням ведаў і ўменняў і не ў фіксацыі ў ацэначнай форме іх недахопаў або памылак, а ў ініцыіраванні абмеркаванняў, самастойнай ацэнкі дзейнасці вучняў з дапамогай розных сітуацый;
- назірае. Назіранне, якое праводзіць кіраўнік праекта, з аднаго боку, накіравана на атрыманне інфармацыі, якая дазволіць настаўніку прадуктыўна працаваць падчас кансультацый, а з другога — складзе аснову для яго дзеянняў па ацэнцы ўзроўню сфарміраваных кампетэнцый вучняў.

***Рэкамендацыі па выкарыстанні праектнай тэхналогіі***

Метад праектаў з'яўляецца важным фактарам фарміравання ў вучняў умення вучыцца. У працэсе праектнай дзейнасці пазнавальны інтарэс вучняў выступае рухальнай сілай у пошуках адказаў на шматлікія пытанні.

Метад праектнай дзейнасці дазваляе выкарыстоўваць веды, атрыманыя ў ходзе вучэбнай дзейнасці на практыцы; фарміраваць актыўную, самастойную пазіцыю вучняў; развіваць даследчыя, самаацэначныя і рэфлексіўныя навыкі. Вынік кожнага праекта можна ўбачыць, асэнсаваць, прымяніць на практыцы. Праектная дзейнасць спрые

развіццю самастойнага мыслення, самаарганізацыі, супрацоўніцтва з дарослымі і равеснікамі, а таксама творчаму і эстэтычнаму складніку духоўна-маральнага выхавання.

Работа над праектам дае шырокае поле для выхавання адказнасці за даручаную справу, праяўлення ініцыятывы, узаемадапамогі.

У аснову кожнага праекта пакладзена якая-небудзь праблема, і для таго, каб яе вырашыць, вучням неабходна не толькі ведаць матэрыял, але і валодаць вялікім аб'ёмам разнастайных прадметных ведаў. Акрамя таго, вучні павінны валодаць пэўнымі інтэлектуальнымі, творчымі і камунікатыўнымі ўменнямі.

Змест праектаў у сферы маральнасці будуецца на базавых нацыянальных каштоўнасцях:

- родная зямля, міласэрнасць, адказнасць, дабрыня, увага, клопат;
- грамадзянская супольнасць, свабода сумлення і веравызнання, талерантнасць, павага да бацькоў, клопат пра старэйшых і малодшых;
- духоўны свет чалавека, гонар, годнасць, маральны выбар, павага да працы, сэнс жыцця, эстэтычнае і этычнае развіццё, унутраная культура, экалагічная адукаванасць.

***Класіфікацыя праектаў***

- Практыка-арыентаваныя праекты. Гэта праекты, якія абавязкова арыентаваны на сацыяльныя інтарэсы ўсіх удзельнікаў (стварэнне праграмы дзеянняў, праекта закона, слоўніка, дызайна дома і г. д.).
- Гульнявыя праекты. Удзельнікі праекта прымаюць на сябе пэўныя ролі, абумоўленыя характарам і зместам праекта, спецыфікай яго праблем.
- Інфармацыйныя праекты. Накіраваны на збор і аналіз інфармацыі пра аб'ект. Такія праекты патрабуюць добра вызначанай структуры, якая дазваляе па ходу работы над праектам уносіць карэкціроўкі.
- Творчыя праекты. Прадугледжваюць адпаведнае афармленне вынікаў у выглядзе сцэнарыя фільма, драматызацыі, праграмы свята, плана сачынення, артыкула, рэпартажу і г. д.

Працуючы над выкананнем праектных заданняў, вучні збіраюць партфоліа. Партфоліа — гэта папка, у якой сабраны ўсе працоўныя матэрыялы праекта, у тым ліку чарнавікі, штодзённыя планы, справаздачы і інш. Афармляючы партфоліа, дзеці вучацца сістэматызоўваць інфармацыю і прэзентаваць атрыманы вынік. Партфоліа таксама можа стаць адной з форм прэзентацыі праекта.

Пры арганізацыі кожных заняткаў настаўнік павінен арыентавацца на дапаможнік для вучняў. Дыдактычныя матэрыялы для вучняў структураваны па этапах праектнай дзейнасці. Распрацаваныя заданні накіраваны на фарміраванне ў вучняў універсальных складнікаў функцыянальнай адукаванасці на аснове актуалізацыі ўяўленняў вучняў пра нацыянальную культурную спадчыну з улікам рэгіянальнай спецыфікі.

Функцыянальная адукаванасць у сацыяльна-грамадзянскай галіне і ў сферы маральнасці ў працэсе праектнай дзейнасці на факультатыўных занятках «Шчаслівы беларусам звацца» накіравана на фарміраванне гатоўнасці вучняў да самапазнання, самаразвіцця, удасканалення, самаацэнкі, асобаснага самавызначэння; гатоўнасці да крытычнага ўспрымання разнастайнай інфармацыі; міжасобаснай камунікацыі і пераадолення цяжкасцей у сітуацыях міжасобаснага ўзаемадзеяння; гатоўнасці да дзейнасці ў сучасным свеце па законах дабра, сумлення, гонару, справядлівасці, патрыятызму і грамадзянскага абавязку, а таксама самастойнай пазнавальнай і творчай дзейнасці для ажыццяўлення жыццёвага выбару і супрацьстаяння негатыўным уплывам асяроддзя.

Функцыянальная адукаванасць у сацыяльна-грамадзянскай галіне і ў сферы маральнасці ў працэсе праектнай дзейнасці на факультатыўных занятках:

- прадугледжвае засваенне ведаў пра маральныя асновы грамадства, яго маральныя ідэалы; культурныя і духоўна-маральныя традыцыі беларускага народа; гісторыю і сімвалы Беларусі; творы мастацкай культуры, іх аўтараў і г. д.;
- арыентуе на агульначалавечыя (сумленнасць, клопат пра іншых, шанаванне жыцця, справядлівасць, годнасць, павага да іншых) і сацыяльныя (свабода, дэмакратыя, павага да роднай мовы і культуры, патрыятызм, культурная разнастайнасць, памяркоўнасць, законнасць, салідарнасць, адказнасць, раўнапраўе) каштоўнасці;
- спрыяе фарміраванню ў вучняў адказнасці, грамадзянскасці, патрыятызму, талерантнасці, працавітасці, бесканфліктнасці, камунікабельнасці, жыццярадаснасці, аптымістычнасці, эмпатыі, стрэсаўстойлівасці, лідарства, дапытлівасці, інтэлектуальнай смеласці, інтуіцыі, крэатыўнасці.

***Крытэрыі ацэнкі ходу і вынікаў праектнай дзейнасці***

Пры арганізацыі факультатыўных заняткаў у комплексе ацэньваецца ступень сфарміраванасці ўменняў і навыкаў функцыянальнай адукаванасці вучняў, а таксама ступень задзейнічанасці іх у праекце і адказнасці за выкананне задач. Ацэньваецца як атрыманы ў ходзе праектнай дзейнасці вынік, так і яго прэзентацыя.

Пры ацэнцы вынікаў праектнай дзейнасці важна ўлічваць наступныя аспекты:

1. Асновай ацэначнай дзейнасці можа стаць фарміруючае ацэньванне, якое здзяйсняецца ў працэсе вучэбнай і праектнай дзейнасці і накіравана на аналіз метапрадметных і асобасных вынікаў вучняў.

Сэнс і мэта ацэньвання на факультатыўных занятках — гэта не кантроль, а адваротная сувязь і карэкціроўка дзеянняў вучняў. Такім чынам настаўнік можа матываваць іх да самааналізу, кіраваць адукацыйнай траекторыяй, стымуляваць да дасягнення новых адукацыйных мэт.

Фарміруючае ацэньванне магчыма толькі ў сітуацыі даверу паміж настаўнікам і вучнямі, калі памылка з’яўляецца натуральным працягам актыўнай працы і пошуку і можа быць выпраўлена ў атмасферы падтрымкі і ўзаемапавагі.

2. Для ацэнкі метапрадметных вынікаў можа быць выкарыстана крытэрыяльнае ацэньванне. Крытэрыямі ацэнкі праекта могуць быць: якасць пастаноўкі мэт і задач; аналіз праблемы; дакладнасць планавання/прагназавання; каштоўнасць ідэі; разнастайнасць крыніц і падыходаў, якія выкарыстоўваюцца пры рэалізацыі праекта; глыбіня раскрыцця праблемы; асабістая зацікаўленасць у рэалізацыі праекта; якасць прэзентацыі і інш.

Крытэрыі павінны быць:

- пазначаны да пачатку заняткаў;
- дакладнымі і зразумелымі вучням.

Комплексны падыход у ацэнцы вынікаў праектнай дзейнасці прадугледжвае шматаспектны аналіз усіх элементаў праекта. Пры гэтым важна выявіць ступень самастойнасці ў ажыццяўленні асобных этапаў праектнай дзейнасці.

Настаўнік можа распрацаваць аўтарскую методыку ацэньвання вынікаў дзейнасці на факультатыўных занятках з улікам асаблівасцей класа (групы вучняў) і зместу навучання.

3. Надзвычай каштоўнай з’яўляецца не толькі ацэнка настаўніка, але і самаацэнка вучня, якую варта праводзіць на кожных занятках на этапе рэфлексіі.

## ПРЫКЛАДНАЕ ТЭМАТЫЧНАЕ ПЛАНАВАННЕ

(1-ы год навучання, 35 гадзін)

| Нумар модуля | Назва модуля | Колькасць гадзін | Віды дзейнасці |
|---|---|---|---|
| | Уводзіны ў праектную дзейнасць | 1 | Тэматычны агляд праектаў факультатыўных заняткаў |
| 1 | Свая хатка — як родная матка | 7 | Пошук інфармацыі; аналіз літаратурных тэкстаў, складанне карты славутасцей мясцовасці і слоўных партрэтаў герояў мастацкіх твораў; падрыхтоўка анатацыі гістарычнага будынка |
| 2 | Нашу дачку пазнаюць і ў андарачку | 7 | Пошук інфармацыі; аналіз гістарычнай, этнаграфічнай і публіцыстычнай літаратуры; сістэматызацыя атрыманай інфармацыі і крытычнае яе выкарыстанне з мэтай стварэння эскізаў сучаснага адзення з элементамі нацыянальнага касцюма рэгіёна; чытанне карты разнавіднасцей сялянскага строю па рэгіёнах; складанне пашпарта нацыянальнага строю |
| 3 | Што хутарок — то гаварок, што сяльцо — то слаўцо | 6 | Пошук інфармацыі; аналіз літаратурных тэкстаў; чытанне, запаўненне і карэкціроўка табліц |
| 4 | Смачна было, ды блізка дно | 5 | Пошук інфармацыі; аналіз літаратурных тэкстаў; падрыхтоўка інтэрв'ю; наведванне віртуальных экскурсій; складанне тэхналагічных карт мясцовых страў |
| 5 | На ўсё свае песні: на вяселлі вясельныя, а на хрысцінах хрысцінныя | 9 | Пошук інфармацыі; аналіз тэкстаў; выкананне творчых заданняў; падрыхтоўка сцэнарыяў народных абрадаў |

# Уводзіны ў праектную дзейнасць (1 гадзіна)

Рэкамендуецца пазнаёміцца з важнай тэарэтычнай інфармацыяй:

***Праектная дзейнасць*** — гэта сумесная вучэбна-пазнавальная, творчая або гульнявая дзейнасць, што мае агульную мэту, узгодненыя метады, спосабы дзейнасці, накіраваныя на дасягненне агульнага выніку. Праектная дзейнасць спрыяе развіццю самастойнасці, мэтанакіраванасці, адказнасці, настойлівасці, талерантнасці, ініцыятыўнасці. У працэсе работы над праектам дзеці набываюць сацыяльную практыку за межамі ўстановы адукацыі, адаптуюцца да сучасных умоў жыцця.

У аснове праектнай дзейнасці знаходзяцца развіццё пазнавальных навыкаў і крытычнага і творчага мыслення, уменні самастойна канструяваць свае веды і арыентавацца ў інфармацыйнай прасторы, а таксама бачыць і фармуляваць праблему. Дасягненне дыдактычнай мэты магчыма праз дэталёвую распрацоўку праблемы, якая павінна завяршыцца рэальным практычным вынікам, афармленым пэўным чынам. Праект прадугледжвае рашэнне праблемы, выкарыстанне разнастайных прыёмаў і інтэграваных ведаў з розных галін навукі, тэхнікі, творчых галін.

***Этапы праектнай дзейнасці:***

1. Вызначэнне праблемы. Важна вызначыць актуальную праблему для даследавання, якая адпавядала б узросту, здольнасцям і ведам вучняў.

2. Вызначэнне мэты і задач. Настаўнік дапамагае вучням вызначыць мэту даследавання, накіраваць дзяцей на дасягненне выніку.

3. Падрыхтоўка і планаванне. На дадзеным этапе важна падабраць форму выканання праекта ў адпаведнасці з тэматыкай, а таксама вызначыць сродкі і метады арганізацыі дзейнасці. Калі гэта праект групавы, то настаўнік павінен скласці працоўныя групы з вучняў, якія будуць сумесна працаваць над праектам. Важна арыентаваць іх на пошук патрэбных матэрыялаў. Настаўнік павінен дапамагчы ў апрацоўцы інфармацыі.

4. Рэалізацыя праекта. Работа над праектам пачынаецца са збору інфармацыі, яе аналізу і абмеркавання. Як толькі патрэбная інфармацыя будзе сабрана і праведзены ўсе эксперыментальныя работы, ажыццяўляецца афармленне праекта. На гэтым этапе настаўнік павінен аказваць кансультацыйную дапамогу вучням, вучыць іх аналізаваць і абагульняць факты, афармленню і прэзентацыі, пры неабходнасці знаходзіць спосабы стымулявання іх цікавасці да творчага працэсу. Надзвычай важна правяраць прамежкавыя вынікі праектнай работы вучняў.

5. Падвядзенне вынікаў. Вынікам праекта з'яўляецца яго прэзентацыя. Яна можа праходзіць у выглядзе афармлення стэндаў; падрыхтоўкі артыкула для электроннай энцыклапедыі; распрацоўкі маршруту, квэст-экскурсіі; складання паведамлення — прагнозу развіцця рэгіёна і інш.

# Модуль 1.
# Свая хатка — як родная матка

***Мэта праекта*** — выхаванне асобы, якая паважае гісторыю і культуру сваёй мясцовасці і зацікаўлена ў аднаўленні і захаванні яе галоўных матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

**I. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці** (1 гадзіна).

Важна разгледзець пытанні для роздуму над праектам.

Перад выкананнем задання 1 рэкамендуецца пазнаёміцца з наступнай інфармацыяй:

Да гістарычных помнікаў могуць адносіцца археалагічныя помнікі, старыя жылыя і гаспадарчыя пабудовы, як захаваныя ў добрым стане, так і іх руіны; помнікі храмавага дойлідства розных рэлігійных канфесій; старадаўнія сядзібы і сядзібныя паркі; фрагменты комплекснай забудовы вёсак, мястэчак і гарадоў, абарончых збудаванняў; участкі брукаваных дарог; месцы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю вядомых асоб і г. д.

Варта ведаць, што нават калі ад гістарычнага помніка захаваўся толькі фундамент, то ён можа ў будучым быць адноўлены; падобны будынак будзе лічыцца аўтэнтычным.

Вучням прапануецца выканаць заданне 1. Пры вызначэнні характарыстык, уласцівых гістарычным збудаванням, можна прапанаваць вучням працягнуць ланцужок слоў: *старажытны, каштоўны, шматвекавы, знакаміты,* ... . А пры фармуліроўцы другіх назваў да малюнкаў з гістарычнымі збудаваннямі можна, з аднаго боку, арыентавацца на малюнак, улічваючы задумку аўтара ілюстрацыі, а з другога — абапірацца на факты, звязаныя з гісторыяй помніка архітэктуры.

Важным інструментам для выбару прадмета даследавання вучняў можа стаць заданне скласці карту яскравых і адметных славутасцей мясцовасці.

Пасля работы над заданнем 1 варта зрабіць кароткае падагульненне па пытаннях, прапанаваных у дыдактычных матэрыялах.

**II. Збор інфармацыі пра архітэктуру, дойлідства, быт, прадметы хатняга ўжытку мясцовасці** (1 гадзіна).

У працэсе збору інфармацыі пра архітэктуру, дойлідства, быт, прадметы хатняга ўжытку мясцовасці ў першую чаргу неабходна абапірацца на фонды школьных, раённых і гарадскіх бібліятэк. Асноўнымі крыніцамі інфармацыі стануць даведачныя выданні: энцыклапедыі, даведнікі і часопісы. Акрамя таго, мэтазгодна карыстацца магчымасцямі інтэрнэт-рэсурсаў: віртуальных музеяў, архіваў, бібліятэк і г. д.

Пры выкананні задання 2 можна прапанаваць сістэматызаваць знойдзеныя пра гістарычны будынак крыніцы інфармацыі па наступным прыкладзе:

***Артыкулы ў энцыклапедычных выданнях***

*1. Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 2004.*

*2. ...*

*3. ...*

***Артыкулы ў навуковых выданнях***

*1. Помнікі этнаграфіі: методыка выяўлення, апісання і збірання / Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Сектар этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. — Мінск : Навука і тэхніка, 1981. — 149 с.*

*2. ...*

*3. ...*

***Артыкулы ў інтэрнэт-рэсурсах***

*1. Старадаўняя сядзіба, радавое гняздо Ляжэнскіх [Электронны рэсурс] // Лінова і наваколле. — Рэжым доступу : https://www.linovo.by/?p=4994. — Дата доступу : 19.12.2022.*

*2. …*

*3. …*

Заданне 2 вучні выконваюць самастойна, пасля чаго адбываецца калектыўны абмен інфармацыяй.

**III. Праектная дзейнасць. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: пашпарт і схема (план) гістарычнага збудавання мясцовасці** (2 гадзіны).

Заданні 3–7 выконваюцца паступова, непасрэдна падчас работы над праектам. Таксама настаўнік можа выбраць з іх заданні па ўласным меркаванні.

Перад выкананнем задання 3 рэкамендуецца бегла пазнаёміцца з тэкстам і вызначыць яго асноўную тэму.

Пры выкананні задання настаўнік можа прапанаваць вучням пералік рыс характару, з якіх варта выбраць тыя, што характарызуюць беларусаў:

Уражлівасць, жыццястойкасць, актыўнасць, рашучасць, стрыманасць, трывожнасць, няўпэўненасць, эмацыянальнасць, хітрасць, цярплівасць, талерантнасць, весялосць, вынаходлівасць, музыкальнасць, гасціннасць, працавітасць, пакорнасць, сквапнасць.

Рэкамендуецца разгледзець хара́ктарныя партрэты беларусаў, намаляваныя айчыннымі мастакамі (мал. 1–5). Прапануецца скласці псіхалагічны партрэт аднаго з персанажаў з выкарыстаннем рыс характару, разгледжаных у заданні.



*Мал. 1.* А. Кашкурэвіч. Партрэт Фёдара К.



*Мал. 2.* Г. Вашчанка. Маці



*Мал. 3.* В. Грамыка. Слова пра высакародную старасць



*Мал. 4.* М. Савіцкі. Янка Купала



*Мал. 5.* А. Ісачоў. Аўтапартрэт

Дадатковым да задання 4 можа стаць падрыхтоўка плана тэксту і вылучэнне яго апорных слоў. Можна прапанаваць вучням выбраць лішняе трэцяе словазлучэнне і размясціць пункты плана ў правільнай паслядоўнасці:

1. Старадаўняя сядзіба: пабудова сядзібнага дома; кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт І Стары падараваў сядзібны дом Іжынцам; Аранцы і Ляжэнскія — уладары старадаўняй сядзібы.

2. Маёнтак пасля 1939 г.: рабаванне сядзібнага дома; зруйнаванне сядзібнага дома; росквіт сядзібы ў Аранчыцах.

3. Сядзіба ў Аранчыцах сёння: сучасныя індывідуальныя забудовы; рэшткі парку; адбудаваная сядзіба.

4. Валадары Аранчыцаў у другой палове XVIII — першай палове XX стагоддзя: Павел Ляжэнскі, Юзэфа Дэрамер, прэзідэнт ордэра ўсмешкі.

Адным з элементаў задання 4 можа стаць запаўненне генеалагічнага дрэва сям'і Ляжэнскіх у сэрвісе графічнага дызайна Canva (canva.com).

Дадаткова можна прапанаваць вучням правесці даследаванне: пашукаць узгадкі пра іншых прадстаўнікоў роду Ляжэнскіх і зрабіць пра гэта паведамленне.

Пры выкананні задання 5 варта пазнаёміцца з асноўнымі складнікамі схемы, або плана, сядзібы:

Схема, або план, сядзібы ўяўляе сабой чарцёж, у якім у спрошчаным выглядзе адлюстроўваецца як пабудова, так і сувязь элементаў пабудовы. На схеме можа паказвацца мясцовасць; пабудова, прывязаная да мясцовасці; раслiннасць і іншыя элементы ўпарадкавання тэрыторыі пры дапамозе графічных сімвалаў — умоўных знакаў.

Перад выкананнем заданняў 6–7 прапануецца ўзгадаць асноўныя ўмоўныя абазначэнні, якімі карыстаюцца спецыялісты пры падрыхтоўцы схем і планаў дамоў (кватэр, тэрыторый, паркаў і г. д.), і размеркаваць іх у табліцы (табл. 1).

*Табліца 1*

**Умоўныя абазначэнні**

| **Умоўныя абазначэнні па чытанні мясцовасці** | **Умоўныя абазначэнні па чытанні дома (кватэры)** |
|---|---|
|  Студня |  Шафа |
|  Рака |  Шафа |
|  Луг |  Унітаз |
|  Возера |  Умывальнік |
|  Мост |  Сталы: прамавугольныя, круглыя |

| Умоўныя абазначэнні па чытанні мясцовасці | Умоўныя абазначэнні па чытанні дома (кватэры) |
|---|---|
|  Пешаходная сцежка |  Крэсла |
|   Школа |  Ванна |
|  Групы кустоў. Луг |  Канапа |
|  Забалочанасць. Балоты прахадныя |  Пліта |
|  Агарод. Ралля | |




*Мал. 6.* Двор, дзе *а)* хата, *б)* сені, *в)* камора

Дадатковую інфармацыю пра ўмоўныя абазначэнні па чытанні мясцовасці можна знайсці ў вучэбным дапаможніку «Геаграфія. Фізічная геаграфія» (6 клас).

Як вядома, кожны помнік архітэктуры неабходна анатаваць, г. зн. даць кароткае апісанне, якое раскрывае паходжанне помніка і яго характар. Таму вучням (заданне 6) прапануецца скласці «Пашпартныя звесткі шляхецкай сядзібы Ляжэнскіх» на аснове тэкставай інфармацыі, пададзенай у заданні 4. Для запаўнення графаў пашпарта сядзібы некаторую істотную інфармацыю рэкамендуецца браць у інтэрнэт-крыніцах. Так, пры ўказанні Лінаўскага сельсавета, куды ўваходзілі Аранчыцы, можна ў дужках указаць яго старую назву — Лінёўскі сельсавет, які быў створаны ў 1940 г. У графе «Гаспадар пабудовы» можна ўказаць усіх уладальнікаў сядзібы з моманту яе пабудовы з указаннем гадоў жыцця, прафесіі і пасады (калі вядома). Калі не ўдалося ў тэксце або ў даведачных крыніцах знайсці якую-небудзь інфармацыю, тады ў адпаведную графу трэба паставіць прочырк.

Настаўніку рэкамендуецца нагадаць вучням пра тое, што частка неабходнай інфармацыі можа знаходзіцца ў спасылцы да тэксту задання 4.

Пасля таго як падрыхтуюць пашпарт сядзібы Ляжэнскіх, вучням рэкамендуецца напісаць свае даныя і паставіць подпіс.

Дадаткова да пашпарта сядзібы можна далучыць як яе ілюстрацыі, так і выявы ўладароў радавога гнязда Ляжэнскіх.

**IV. Праектная дзейнасць** (2 гадзіны).

Пры падрыхтоўцы праекта — пашпарта і схемы (плана) гістарычнага збудавання мясцовасці — рэкамендуецца наведаць гістарычны помнік мясцовасці і самастойна яго даследаваць, зрабіўшы адпаведныя фотаздымкі, замалёўкі і апісанні. Калі гістарычны помнік знаходзіцца ў напаўразбураным стане, але пры гэтым захаваліся яго ранейшыя фотаздымкі або замалёўкі, мэтазгодна ўзнавіць першапачатковы выгляд помніка ў вобразе макета або малюнка. Гэта дазволіць вучням лепш уявіць, якім быў гістарычны помнік раней. Калі аб'ектам даследавання стане сядзібны парк, варта скласці падрабязны план, указаўшы на ім захаваныя сляды былых алей, месцы росту, пароды дрэў, найбольш старыя дрэвы, месцы існавання ранейшых паркавых пабудоў і г. д.

Да праекта важна далучыць і пісьмовае апісанне сучаснага выгляду помніка архітэктуры, стану яго захаванасці, а таксама ацаніць гістарычную, архітэктурную, культурную каштоўнасць помніка для сваёй мясцовасці. Акрамя таго, рэкамендуецца сабраць звесткі ў літаратурных крыніцах пра выяўлены помнік гісторыі і яго ўладальнікаў, знайсці старыя фотаздымкі, арганізаваць меры па ахове выяўленага гістарычнага помніка.

**V. Прэзентацыя** (1 гадзіна).

Прэзентацыя праекта можа быць арганізавана ў выглядзе падрыхтаванага інфармацыйнага стэнда, распрацаванага комплексу мер па захаванні помніка архітэктуры і недапушчэнні яго далейшага разбурэння. Прэзентацыю таксама можна спалучыць з добраўпарадкаваннем тэрыторыі.

Асабліва карысным для маральнага выхавання вучняў стане арганізацыя шэфства вучняў над помнікам архітэктуры, якому быў прысвечаны праект.

**VI. Рэфлексія.**

Праводзіць рэфлексію настаўнік можа ў інтэрактыўнай форме. Ён прапаноўвае вучням падзяліцца на каманды ўдзельнікаў (па алфавіту, гендэрных прыметах, колеру вопраткі і г. д.). Рэкамендуецца падрыхтаваць тэкст пра помнік архітэктуры сваёй мясцовасці або напісаны тэкст легенды ці падання, звязанага з гістарычным збудаваннем (яго ўладальнікамі). Камандам-удзельнікам за 10 хвілін прапануецца скласці і запісаць пытанні з адлюстраваннем зместу тэксту (па чарзе). Аркушы з пытаннямі вывешваюцца на дошку, каманды прадстаўляюць свае пытанні, а каманда-супернік на іх адказвае. Настаўнік (або група экспертаў з ліку вучняў) сочыць за правільнасцю складзеных пытанняў і адказаў на іх.

# Модуль 2. Нашу дачку пазнаюць і ў андарачку

***Мэта праекта*** — фарміраванне ў вучняў уменняў выкарыстоўваць элементы беларускага нацыянальнага касцюма ў сучасным адзенні; выхаванне любові і павагі да традыцый і звычаяў сваёй мясцовасці, роднай культуры і культуры іншых народаў.

**І. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці** (1 гадзіна).

Настаўнік прапануе вучням патлумачыць паняцце «строй», пры неабходнасці ўдакладняе і дапаўняе іх выказванні.

Для абмеркавання тэмы праекта настаўнік прапануе невялікі відэафрагмент «Выстаўка беларускага народнага касцюма ў Мінску» (https://blr.belta.by/video/getRecord/1773/) і просіць вучняў адказаць на пытанні пра месца вышыўкі ў адзенні беларусаў, пра значэнне арнаменту ў паўсядзённым жыцці нашых продкаў.

Вучні выконваюць заданне 1.

Рэкамендуецца пазнаёміцца з наступнай культуразнаўчай інфармацыяй:

Беларускі нацыянальны касцюм — унікальны помнік матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, крыніца творчасці, якая займае асаблівае месца ў культурнай спадчыне народа.

Беларускае народнае адзенне фарміравалася на працягу стагоддзяў. Але асноўныя яго віды і састаўныя часткі, спосабы пашыву і кампазіцыйныя рашэнні, каларыстычныя і арнаментальныя асаблівасці пачалі складвацца з канца XIII ст. адначасова з фарміраваннем беларускай народнасці. Касцюм беларусаў развіваўся ў кантакце з касцюмамі рускіх, украінцаў, а таксама літоўцаў, палякаў і іншых народаў, і поруч са сваімі нацыянальнымі рысамі ён узбагачаўся.

Народныя майстры працягваюць справу нашых продкаў. Іх работы ўражваюць сваёй непаўторнасцю, свежасцю і прыгажосцю і сведчаць пра тое, што і сёння існуе непарыўная сувязь пакаленняў, дзякуючы якой жывуць гістарычныя традыцыі, традыцыі нашых продкаў.

Варта зрабіць кароткае падагульненне па пытаннях, прапанаваных у дыдактычных матэрыялах. Рэкамендуецца абмеркаваць праект, прысвечаны стварэнню сучаснага базавага жаночага (мужчынскага) гардэробу з нацыянальнымі элементамі мясцовасці. Варта звярнуць увагу на этапы рэалізацыі праекта, ролю вучняў у ім і інш.

**ІІ. Збор інфармацыі пра беларускі нацыянальны строй** (1 гадзіна).

Настаўнік можа прапанаваць правесці работу па пошуку інфармацыі па наступных напрамках:

- артыкулы ў энцыклапедычных выданнях;
- артыкулы ў газетах і часопісах;
- артыкулы ў інтэрнэт-рэсурсах;
- архіўныя матэрыялы.

Перад выкананнем задання 2 вучням можна прапанаваць скласці спіс усіх знойдзеных матэрыялаў па тэме ў алфавітным парадку.

**ІІІ. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: складанне сучаснага базавага жаночага (мужчынскага) гардэробу з нацыянальнымі элементамі мясцовасці** (2 гадзіны).

Заданне 3 выконваецца пастулова непасрэдна падчас работы над праектам. Настаўнік можа выбраць заданні па ўласным меркаванні.

Тэкст задання 4 можа быць прачытаны вучнямі загадзя, напярэдадні ўроку. Пры гэтым рэкамендуецца пазначаць алоўкам у тэксце прадметы адзення, якія належаць жаночаму або мужчынскаму гардэробу беларуса.

Адказы на пытанні пунктаў 2, 3 задання 4 варта падмацаваць адпаведнымі ілюстрацыямі, змешчанымі ў даведачна-энцыклапедычных выданнях. Акрамя гэтага, рэкамендуецца падрыхтаваць невялікія паведамленні пра беларускія строі, акрэсленыя ў заданні, пры гэтым важна ўлічваць асабістую зацікаўленасць вучняў.

Адной з форм падрыхтоўкі творчага праекта можа быць наведванне краязнаўчага або школьнага музея з мэтай азнаямлення з прадстаўленымі там нацыянальнымі строямі або фотаздымкамі і іншымі матэрыяламі. Неабходна папярэдзіць вучняў, што ім трэба атрымаць дазвол у працаўнікоў музея, каб правесці неабходныя даследаванні.

Табліца «Пашпарт нацыянальнага строю» можа быць дапоўнена наступнай важнай культуразнаўчай інфармацыяй:

- год (перыяд) стварэння (узнікнення, шыцця, бытавання);
- прозвішча майстры касцюма;
- прозвішча ўладальніка касцюма.

Акрамя таго, табліца можа быць дапоўнена фотаздымкам нацыянальнага строю, зробленым падчас экскурсіі.

Пры запаўненні табліцы «Касцюм маёй мясцовасці» можна засярodзіцца на адным або некалькіх прадметах нацыянальнага касцюма. Пры гэтым варта звяртаць увагу на дэталі касцюма: размяшчэнне вышыўкі ці яе адсутнасць, асаблівасці крою, выкарыстанне тканіны, аздаблення, каляровую гаму, спосабыноскі і г. д. Для параўнаўчага аналізу ў якасці ўзораў можна выкарыстоўваць нацыянальныя строі мясцовасцей, што кардынальна адрозніваюцца паміж сабой.

Дадаткова рэкамендуецца праслухаць беларускую народную песню «Ох, і сеяла Ульяніца лянок» і прасачыць шлях льну ад моманту яго пасеву да пашыву адзення.

Дадатковым матэрыялам да задання 4 (пра тое, дзе і як захоўвалася адзенне нашымі продкамі) можа стаць наступны культуразнаўчы тэкст:

### Куфар жыцця

Куфар зараз амаль выціснуты шафаю, але я кажу аб параўнаўча нядаўнім мінулым, і да таго ж ёсць мясціны, дзе куфар, або скрыня, яшчэ й зараз пануе ў хаце, іх нават яшчэ робяць сям-там. Лепшымі куфрамі лічацца тыя, што робяць у Іванаўскім раёне на Палессі.

Куфар у нас прыблізна такі, як і ў Расіі, і на Украіне, хіба што большы памерам. Часам нават на колцах, як палтаўская скрыня. Адрозненне — у колерах, якімі ён распісаны. Колеры беларускага куфра больш глухія: фіялетавы з чырвоным, карычневы з сінім і чырвоным і г. д. Ды акрамя кветак і «букетаў» на нашых куфрах ёсць яшчэ стылізаваныя фігуркі людзей, коней і г. д.

Шырокі, высокі, акованы куфар,
Малёваны вокал, з клямкаю са сталі,
Не ўстыдно б такому і на панскі хутар.
Куфар не замкнёны, бо ў нас не кралі.

У пахучым куфры важка ўсё ляжала,
Што сама бабуля працай рук прыдбала.
Быццам водар з поля пранясло ля хаты,
Так запахла лугам, чабаром і мятай.

*Паводле Уладзіміра Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі».*



*Мал. 7.* Куфры Беларусі

Варта пазнаёміць вучняў з вядомым даследчыкам беларускага нацыянальнага касцюма М. Раманюком (заданне 5).

Міхась Раманюк правёў шмат экспедыцый у розныя куточкі Беларусі па выяўленні і зборы скарбаў народнага касцюма. Ён выдаў некалькі альбомаў нацыянальных касцюмаў і вызначыў у Беларусі 22 варыянты нацыянальнага касцюма па 6 рэгіёнах: Цэнтральная Беларусь, Заходняя Беларусь, Палессе, Панямонне, Падзвінне і Падняпроў'е.

Пры выкананні задання 6 вучнямі могуць быць выкарыстаны шаблоны і трафарэты беларускіх арнаментаў, а для вучняў старэйшых класаў цікавай і творчай будзе работа па стварэнні арнаментаў на аснове матэрыялаў выдання М. П. Жабінскай «Складзі ўзор сам» [4], а таксама складанне ўзораў у дызайнерскай графічнай праграме Adobe Illustrator.

Для найбольш дакладнага графічнага выяўлення галуба і галубкі (пункт 4 задання 6) настаўніку неабходна звярнуць увагу вучняў на традыцыю адлюстравання гэтай птушкі ў ткацтве.

Пасля выканання гэтага задання можна прапанаваць вучням этнаграфічныя матэрыялы, што пацвярджаюць асаблівае стаўленне нашых продкаў да сімвалізму вышыўкі і яе значэнне:

**Паэтыка жаночай душы**

Пра свае вырабы майстрыхі могуць расказваць цэлыя паэмы. Паслухаем васьмідзесяцігадовую Н. Гаравую: «Усё, што я бачыла і перажыла, я выткала і вышыла на посцілках і ручніках. Калі мне было 17 гадоў, я закахалася ў Паўліка. Белагаловы, з сінімі вачыма, ён быў дужа добры. Мне параілі бабулі, і я вышыла ручнік з голубам і галубкай. Калі Паўлік пачуў пра гэта, прыслаў да мяне сватоў, і мы пажаніліся. Вось якое дабро зрабілі гэтыя галубкі. Ды здарылася няшчасце. У мяне забалеў жывот, не нараджаліся дзеці. Стала я пытацца ў бабак, яны і параілі мне вышыць Маці-Радзіцельніцу і Святое Дрэва. Пасля гэтага перастаў балець жывот, пайшлі дзеці. Я была шчаслівая і давольная».

Е. Краўцова вышыла ручнік у некалькі радоў. У першым — 5 постацей Лады, у другім — 4 ружы, у трэцім — 4 галубы і галубка. У свае 18 гадоў яна хацела, каб яе кахаў Міхась. А другі ручнік, як ёй параіла настаўніца, яна выткала ў падарунак мужу. На ім — Лада, па баках — ружы. Гэта — прыгажосць і каханне. Тут жа і подпіс: «Люблю цябе, любі мяне». «Я веру ў ручнік. Ён мае вялікую сілу», — сказала жанчына *(Паводле Міхаіла Кацара «Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка»).*

Апошнім дадатковым заданнем можа стаць запаўненне анкеты, якое дапаможа вучням у падрыхтоўцы праекта:

***Адзенне сучаснага чалавека***

1. Якому стылю адзення вы аддаяце перавагу?
   а) Спартыўнаму;
   б) класічнаму;
   в) кантры;
   г) oversize.
2. Якія колеры ў адзенні для вас актуальныя?
   а) Манахромныя;
   б) featured: рознакаляровыя;
   в) ____________ (ваш адказ).
3. З якой тканіны павінна быць сучаснае адзенне?
   а) З натуральных: бавоўна, воўна, шоўк, лён;
   б) сінтэтычных;
   в) натуральных і сінтэтычных.
4. Якую колькасць прадметаў адзення павінен складаць гардэроб сучаснага чалавека?
   а) Колькасць прадметаў мяняецца ў залежнасці ад сезону;
   б) чым болей, тым лепей;
   в) ____________ (ваш адказ).
5. Што Вы робіце з аддзенем, калі яно вам ужо непатрэбна?
   а) Раздаю людзям;
   б) аддаю на перапрацоўку;
   в) выношу на сметніцу.

**IV. Праектная дзейнасць** (2 гадзіны).

Пры складанні сучаснага базавага жаночага (мужчынскага) гардэробу з нацыянальнымі элементамі мясцовасці спачатку варта разабрацца з тым, што сабой уяўляе базавы гардэроб.

Базавы гардэроб, як правіла, складаецца з некалькіх прадметаў адзення, пераважна класічнага стылю, якія вельмі добра міксуюцца як паміж сабой, так і з іншымі прадметамі гардэробу. Пераважна гэта класічная блузка, белая футболка, вадалазка, джынсы, класічныя штаны, спадніца-аловак, чорная сукенка, кардыган, світар, жакет (пінжак). Што трэба ведаць для таго, каб скласці базавы гардэроб?

Трэба прытрымлівацца некалькіх ***асноўных правіл***:

1. Прадметы адзення павінны адпавядаць ладу жыцця чалавека. Напрыклад, калі чалавек бізнесмен, то наўрад ці ён будзе насіць джынсы з вялікімі дзіркамі, а маладая маці не апране вячэрнюю сукенку.

2. Прадметы адзення павінны адпавядаць вашаму ўнутранаму стану і прынцыпу «гэта адзенне я магу апрануць сёння». Гэта значыць, што ў базавы гардэроб не ўваходзяць тыя рэчы, якія б вам хацелася апрануць у нявызначанай будучыні (калі выраcту, калі мяне запросяць на дзень нараджэння і г. д.).

3. Прадметы адзення павінны быць такога фасону, які найбольш падыходзіць вашаму тыпу фігуры: падкрэслівае і скрывае тое, што трэба. Важна разумець, што гэта могуць быць не абавязкова модныя рэчы.

4. Прадметы адзення павінны быць з якасных матэрыялаў.

5. Кожная рэч базавага гардэробу павінна спалучацца з некалькімі рэчамі старога гардэробу.

Пры складанні гардэробу варта прадставіць як прадметы верхняга і лёгкага (касцюмна-сукеначная група) адзення, так і абутак і аксесуары.

Пасля таго як базавы гардэроб будзе падабраны, варта засяродзіць увагу вучняў на выкарыстанні ў ім нацыянальных беларускіх элементаў. Гэты від дзейнасці вучні могуць выконваць самастойна. Рэкамендуецца пры гэтым рабіць эскізы. Пасля чаго варта калектыўна абмеркаваць усе прапанаваныя вучнямі варыянты ўласнага базавага гардэробу.

**V. Прэзентацыя** (1 гадзіна).

Прэзентацыя праекта можа быць арганізавана ў выглядзе падрыхтаваных вучнямі эскізаў базавага гардэробу з каментарыямі аўтараў, фотаальбома з дадатковай інфармацыяй па гісторыі касцюма. Акрамя таго, цікавай рэалізацыяй праекта можа стаць арганізацыя паказа моды ў межах інфармацыйных і забаўляльных мерапрыемстваў установы адукацыі.

**VI. Рэфлексія.**

Падчас рэфлексіі настаўніку варта прапанаваць вучням выказацца па тэме праекта. Калі думкі вучняў пакажуцца няяснымі, варта іх удакладніць. Напрыканцы заняткаў усе выказванні калектыўна абмяркоўваюцца. Настаўніку рэкамендуецца іх падагульніць.

# Модуль 3. Што хутарок — то гаварок, што сяльцо — то слаўцо

***Мэта праекта*** — фарміраванне грамадзянскай ідэнтычнасці; асэнсаванне, развіццё і павелічэнне пачуцця нацыянальнай унікальнасці вучняў; развіццё цікавасці да гісторыка-культурнага мінулага і сучаснасці мясцовасці.

**І. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці** (1 гадзіна).

Важна разгледзець пытанні для роздуму над праектам.

Вучням прапануецца выканаць заданне 1.

Неабходна зрабіць кароткае падагульненне па пытаннях, прапанаваных у дыдактычных матэрыялах.

Рэкамендуецца абмеркаваць праект, прысвечаны стварэнню слоўніка «Мясцовыя дзіцячыя гульні і забавы ў гаворках мясцовасці», яго этапы рэалізацыі, прэзентацыю праекта і інш.

**ІІ. Збор інфармацыі пра дыялектныя асаблівасці мясцовасці** (1 гадзіна).

У працэсе збору інфармацыі пра дыялектныя асаблівасці мясцовасці ў першую чаргу неабходна абапірацца на фонды школьных, раённых, гарадскіх бібліятэк. Асноўнымі крыніцамі інфармацыі стануць даведачныя выданні (слоўнікі, энцыклапедыі, даведнікі) і творы мастацкай літаратуры. Пры гэтым рэкамендуецца выкарыстаць матэрыялы жывой дыялектнай мовы, узоры якой можна знайсці ў віртуальнай бібліятэцы (https://philology.by/).

Перад выкананнем задання 2 вучням можна прапанаваць сістэматызаваць усе знойдзеныя пра дыялектныя асаблівасці мясцовасці крыніцы інфармацыі па наступным прыкладзе:

***Творы мастацкай літаратуры***

*1. Барадулін, Р. Збор твораў : у 5 т. / Р. Барадулін. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1996—2002. — Т. 4 : Крытычныя артыкулы. Успаміны. Літаратурныя запісы. Вушацкі словазбор. — 2002. — 501 с.*

*2. ...*

*3. ...*

***Спецыяльная літаратура***

1. *Дыялекталагічны атлас беларускай мовы: уступныя артыкулы, даведачныя матэрыялы і каментарыі да карт / Р. І. Аванесаў і інш. — Мінск : Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1963. — 969 с.*

*2. ...*

*3. ...*

Заданне 2 вучні выконваюць самастойна, пасля чаго адбываецца калектыўны абмен інфармацыяй.

**ІІІ. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: слоўнік «Мясцовыя дзіцячыя гульні і забавы ў гаворках мясцовасці»** (2 гадзіны).

Перад выкананнем задання 3 варта прапанаваць з «воблака слоў» (мал. 8) вылучыць не менш за 5 слоў, якія вучні будуць даследаваць згодна з матэрыяламі «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» (https://philology.by/labng):




*Мал. 8.* «Воблака слоў»

Выконваючы заданне 3 варта мець на ўвазе, што ў адным рэгіёне магло ўжывацца некалькі форм аднаго і таго ж слова, якія абавязкова трэба ўнесці ў табліцу па наступным прыкладзе (табл. 2).

*Табліца 2*

**Літаратурная і дыялектычная форма слоў**

| Слова ў сучасным выкарыстанні | Дыялектная форма слова ў вашай мясцовасці | Дыялектная форма слова ў Мінскай вобласці | Дыялектная форма слова ў Гродненскай вобласці | Дыялектная форма слова ў Магілёўскай вобласці | Дыялектная форма слова ў Гомельскай вобласці | Дыялектная форма слова ў Брэсцкай вобласці | Дыялектная форма слова ў Віцебскай вобласці |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| адуванчык (дзьмухавец) | дзьмухавец | адуванчык | малачай | адуванчык, малачай, малошнік | адуванчык | малачэй, малачай, малач'як, адуванчык, молочій | пухоўка, адуванчык, малошнік |

Мэтазгодна на занятках пазнаёміцца з песнямі «Родная мова» ў выкананні вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры» і «Беларуская мова» ў выкананні групы «Дразды». Варта параўнаць літаратурны і музычны кампанент гэтых двух твораў.

Падчас работы над заданнем 5 настаўніку рэкамендуецца дапоўніць урок важнай культуразнаўчай інфармацыяй:

Сучасныя беларускія імёны — гэта змененыя, трансфармаваныя паводле законаў беларускай фанетыкі і марфалогіі ў асноўным грэчаскія і рымска-каталіцкія імёны. Напрыклад, звыклае беларускае імя Ульяна паходзіць ад рымскага Юліана, Тацццяна — ад Тацiана, Ахрэм — ад грэчаскага Ефраім, Астап — ад Еўстафіос. Папулярнае ў многіх славянскіх і неславянскіх народаў імя Пятро (запазычанае ў старажытных грэкаў) у мове беларусаў набыло некалькі варыянтаў: Пятрусь, Петра, Пятрук, Пятрок; вядомы і яго жаночы адпаведнік Пятруня. Імя Галіна ў слоўніках тлумачыцца па-рознаму. Адны бачаць яго паходжанне ў лацінскім «курыца», іншыя — у грэчаскім «бязветра», «ціш». Але, як устаноўлена, Галінамі жанчын не называлі ні ў Грэцыі, ні ў Рыме. Не сустракаецца гэта імя і ў краінах Заходняй Еўропы. А на тэрыторыі Беларусі яно вельмі распаўсюджанае вось ужо некалькі стагоддзяў. Імя Галіна — чыста беларускае і паходзіць ад слова «галіна» — бакавы адростак на ствале; сук з веццем.

У многіх нашых імёнах адчуваюцца іх самабытнасць, нацыянальная спецыфіка, мілагучнасць. Гэта асабліва праяўляецца ў псеўданімах дзеячаў беларускай культуры,

літаратуры, у імёнах літаратурных персанажаў: Янка Купала, Якуб Колас, Янка Маўр, Кузьма Чорны, Цішка Гартны, Алесь Жаўрук, Змітрок Бядуля, Васіль Вітка, Зоська Верас, Міхась Чарот, Якім Каліна, Алесь Гарун, Янка Журба, Максім Беларус. Беларусы нарадзілі далікатныя і мілагучныя імёны: Міхась, Антось, Адась, Юрась, Карусь, Пятрусь *(Паводле В. Шура «Беларускія ўласныя імёны»).*

Вучням рэкамендуецца запісаць беларускія формы сваіх імёнаў.

Варта сфакусіраваць увагу вучняў на тым, каб вылучыць у тэксце рэгіяналізмы і раскрыць іх сэнс.

Настаўнік можа звярнуць увагу вучняў на тое, што ў кожнай мясцовасці Беларусі можна заўважыць уласцівыя толькі ёй моўныя асаблівасці, а таксама характэрныя звычаі і традыцыі. Паказаць такія спецыфічныя асаблівасці можна на прыкладзе Брэсцкага рэгіёна:

**Тэхніка ўкладвання валасоў на Жабінкаўшчыне і Камянеччыне**

Валасы закручвалі ззаду ў вузел — «кіхіл» — і хавалі пад чапец. Летам дзяўчаты і жанчыны насілі «кібалкі» — невялікія палатняныя павязкі, якія складвалі шырынёй у далонь і завязвалі канцамі назад (канцы звісалі да сярэдзіны спіны), а спераду для ўтрымання формы падкладвалі кардонку. У пачатку XX ст. старыя замужнія жанчыны адпаведна колішняй модзе яшчэ насілі «тканкі» і «кібалкі» — вакол драўлянага абручыка выкладвалі косы, а паверх іх накладалі хустку, канцы якой завязвалі пад падбародкам. Маладой на вяселлі раней павязвалі галаву белым платам, які рабілі з куплёнай тканіны. Пазней галаву маладой пачалі ўпрыгожваць «кітайкай» — вянком з папяровых кветак і прывязанымі да яго стужкамі *(Паводле «Традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў»).*

Калі вучняў асабліва зацікавяць народныя абрады, звязаныя са звычаямі прыбірання валасоў, абстрыгання і г. д., варта прапанаваць для азнаямлення наступныя абрады: абворванне, «завіванне маладой», падстрыганне і падсмальванне валасоў, «пастрыжыны».

Перад чытаннем тэксту задання 6 вучням рэкамендуецца хутка прагледзець яго і выказаць сваё меркаванне адносна тэмы. Пасля знаёмства з тэкстам варта выпісаць незнаёмыя словы з іх тлумачэннямі ў сшытак.

Пры выкананні задання варта запісаць правілы гульняў, аднавіўшы іх лагічную паслядоўнасць, на прыкладзе гульні «Вяровачка»:

1. Усе стаяць у коле, узяўшыся за вяроўку.
2. Вядучы гульні стаіць у крузе з завязанымі вачыма.
3. Дзяўчаты і хлопцы ўхіляюцца ад вядучага гульні.
4. Вядучы гульні ловіць дзяўчат і хлопцаў.
5. Дзяўчаты і хлопцы трымаюцца за вяроўку.

Выконваць заданне можна ў групах. Варта звярнуць увагу вучняў на тое, што пры напісанні правіл неабходна ўлічваць сцісласць выкладання дзеянняў, выкарыстоўваючы дзеясловы ў пачатку сказа.

Мяркуецца форма рэалізацыі праекта — слоўнік «Мясцовыя дзіцячыя гульні і забавы ў гаворках мясцовасці». Мэтазгодна пазнаёміцца з тлумачэннем слова «слоўнік»:

«Слоўнік — даведачная кніга, якая змяшчае словы, размешчаныя ў пэўным парадку, тлумачыць значэнні ўключаных адзінак, дае розную інфармацыю пра іх або іх пераклад на іншую мову» *(Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы).*

Пры складанні слоўніка «Мясцовыя дзіцячыя гульні і забавы ў гаворках мясцовасці» рэкамендуецца ўлічваць наступную структуру артыкула:

1. Галоўнае слова (пададзенае ў алфавітным парадку).
2. Тлумачэнне слова (апісанне гульні).

3. Цытаты з гульні (дыялектычная версія).
4. Ілюстрацыя гульні (пры наяўнасці).
5. Месца фіксацыі (месца распаўсюджвання).

**IV. Праектная дзейнасць** (1 гадзіна).

Праект можа ажыццяўляцца ў форме слоўніка «Мясцовыя дзіцячыя гульні і забавы ў гаворках мясцовасці». Калі ў ходзе заняткаў не былі знойдзены гульні, што зацікавяць вучняў, можна падрыхтаваць слоўнік «Дзіцячыя цацкі мясцовасці».

**V. Прэзентацыя праекта** (1 гадзіна).

Прэзентацыя праекта можа праходзіць у форме забаўляльнага (спартыўна-забаўляльнага) мерапрыемства, у ходзе якога будуць рэканструяваны і адаптаваны некаторыя знойдзеныя гульні мясцовасці.

**VI. Рэфлексія.**

У ходзе рэфлексіі настаўніку рэкамендуецца акцэнтаваць увагу вучняў на тым, што нацыянальная мова з'яўляецца галоўным багаццем нацыянальнай культуры і выступае як падмурак, на якім фарміруецца нацыянальная свядомасць беларусаў. Пры правядзенні рэфлексіі настаўніку варта выкарыстаць прыём акраслова. Вучням прапануецца падабраць эпітэты да беларускай нацыянальнай мовы, зашыфраваныя ў прозвішчы аднаго з заснавальнікаў беларускай дыялекталогіі *Я. Карскага*.

К (крыштальная).
А (адвечная).
Р (родная, раздольная).
С (спрадвечная, спеўная, сакавітая, старажытная, светлая).
К (крэўная, кроўная).
І (ільняная, іскрыстая).

# Модуль 4. Смачна было, ды блізка дно

Мэта праекта — абуджэнне цікавасці і развіццё павагі да мясцовых культурных традыцый і звычаяў праз спасціжэнне і засваенне страў мясцовай кухні; выхаванне асобы, схільнай да самапазнання і самаразвіцця; усведамленне ролі беларускага народа ў сусветнай гісторыі і культуры.

**I. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці** (1 гадзіна).

Важна разгледзець пытанні для роздуму над праектам і зрабіць па іх кароткае падагульненне.

Рэкамендуецца абмеркаваць праект, прысвечаны стварэнню кнігі рэцэптаў «Мясцовыя стравы», яго этапы рэалізацыі, прэзентацыю і інш.

**II. Збор інфармацыі пра мясцовыя стравы** (1 гадзіна).

У працэсе збору інфармацыі пра мясцовыя стравы ў першую чаргу неабходна абапірацца на фонды школьных, раённых, гарадскіх бібліятэк. Асноўнымі крыніцамі інфармацыі стануць кулінарныя энцыклапедыі; кнігі рэцэптаў, дзе беларускім нацыянальным стравам прысвечаны раздзел кнігі; творы мастацкай літаратуры; наратыўныя крыніцы.

Шмат інфармацыі пра мясцовыя стравы можна знайсці ў падручніках і хрэстаматыях па беларускай дыялектнай мове. У кнігах, акрамя слоў шматлікіх гаворак, утрымліваюцца тэксты, сабраныя ў розных мясцовасцях Беларусі. У іх сустракаецца шмат упамінанняў пра разнастайныя гастранамічныя прыхільнасці нашых продкаў.

Заданне 1 вучні робяць самастойна, пасля чаго адбываецца калектыўны абмен інфармацыяй.

Заданне 2 выконваецца паступова, непасрэдна падчас работы над праектам.

Перад выкананнем задання 3 настаўніку варта звярнуць увагу вучняў на тое, што, каб правільна і якасна зрабіць якую-небудзь страву, варта карыстацца рэцэптам. Для гатавання стравы варта на кухні мець або кухонныя шалі, або абапірацца на асноўныя меры вагі, адзінкі якіх агульнапрынята падаваць наступным чынам:

1 шклянка (250 мл) — 15 ст. л.
1 шклянка (200 мл) — 12 ст. л.
1 ст. л. — 3 ч. л.
1 дэсертная лыжка — 2 ч. л.

Дадатковым заданнем на занятках можа стаць запаўненне наступнай табліцы (табл. 3).

*Табліца 3*

**Табліца мер і вагі прадуктаў**

| Назва | Шклянка 250 мл, г | Шклянка 200 мл, г | Сталовая лыжка, г | Чайная лыжка, г |
|---|---|---|---|---|
| Мука пшанічная | 150 | | 25 | 8 |
| Перац чорны молаты | Х | Х | | 5 |
| Проса | | 190 | 25 | 10 |
| Разрыхляльнік | Х | Х | 11 | 3 |
| Рыс | | | | |

| Назва | Шклянка 250 мл, г | Шклянка 200 мл, г | Сталовая лыжка, г | Чайная лыжка, г |
|---|---|---|---|---|
| Цукар | | | | |
| Сода | | | | |
| Смятана | | | | |
| Фундук ачышчаны | | | | |

Пасля запаўнення табліцы прапануецца выказаць меркаванне наконт таго, чаму не запаўняюцца 1-я і 2-я калонкі ў графах «Перац чорны молаты» і «Разрыхляльнік».

Пры падрыхтоўцы задання 5 вучням рэкамендуецца парамі запісаць беларускія традыцыйныя стравы і іх адпаведнікі ў літоўскай нацыянальнай кухні. *(Правільны адказ: кішка — ведэрай, капыткі беларускія — швільнікай, шупеня — шупініс.)*

Дадатковую інфармацыю пра традыцыі беларускай нацыянальнай кухні вучні могуць знайсці ў падручніку «Працоўнае навучанне. Абслуговая праца» (7 клас, 9 клас).

**III. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: кніга рэцэптаў «Мясцовыя стравы»** (1 гадзіна).

Мяркуецца форма рэалізацыі праекта — кніга рэцэптаў «Мясцовыя стравы». Мэтазгодна пазнаёміцца з агульнапрынятай структурай кнігі рэцэптаў:

Уводзіны (змест кнігі, яе адрасат і мэта).
Абсталяванне, неабходнае для гатавання стравы.
Табліца мер і вагі.
Прадукты (парады па выбары і захаванню).
Рэцэпты (размеркаваныя па раздзелах).
Алфавітны паказальнік.
Парады па ўпрыгожванні страваў, сервіроўцы і г. д.

Пры падрыхтоўцы тэхналагічнай карты стравы «Ласіныя губы ў падсалоджаным воцаце» (заданне 6) варта абапірацца на адаптаваную тэхналогію гатавання гэтай знакамітай шляхецкай стравы (мал. 9):

Ласіныя губы неабходна вымыць, папярэдне выдаліўшы валасы. Нарэзаць на парцыённыя кавалкі, злажыць у шкляны посуд. Выціснуць сок аднаго лімона ў 1 л халоднай вады, пакласці туды губы лася, дадаўшы соль, перац, лаўровы ліст і нарэзаную паўкольцамі цыбулю. Варыць на сярэднім агні каля 2 гадзін. На патэльні спасіраваць цыбулю, далучыўшы да яе губы лася і смажыць каля 2-3 хвілін. Губы ласі з цыбуляй перакладваюцца ў каструлю і заліваюцца смятанай, булёнам з далучэннем лаўровага ліста, журавінавага соку, яблычнага воцату, цукру і тушацца пад накрыўкай яшчэ 1 гадзіну.



*Мал. 9.* Ласіныя губы па-паляўнічы

Пры падрыхтоўцы тэхналагічнай карты можна прапанаваць вучням выкарыстаць уласныя або запазычаныя з інтэрнэту ілюстрацыі.

Настаўнік можа дапоўніць заняткі важнай культуразнаўчай інфармацыяй пра ролю хлеба ў жыцці беларусаў, а таксама пра традыцыі яго гатавання:

Яго Вялікасць хлеб. Ён у хаце — гаспадар, у працы — сябра, а ў дарозе — таварыш. Ён галоўны на нашым стале. Ён — по́кутнік. Яго месца на самым покуце. Пад абразамі. Беларусы заўсёды ставіліся да хлеба з вялікаю павагай і пашанаю — як да Бога. Мы ніколі не елі за голым, не засланым абрусам сталом. Бо ежа нам заўсёды была святам. Мы ніколі не гаварылі пра ежу абразлівыя словы. У нас вялікім грахом лічылася скідваць на падлогу хлебныя крошкі — мы іх акуратненька збіралі ў жменю, елі самі або аддавалі птушкам. Пяклі мы хлеб у сваіх печах. З жытняй, пшанічнай, ячнай, аўсянай мукі. Проста на подзе або на кляновых лістах ды на лістах хрэну. У галодныя гады яго пяклі з той жа бульбаю, буракамі, рэпаю, нават з жалудамі, з мякінаю, з лебядою. Але які ён быў смачны заўсёды! Нават з такімі дабаўкамі. А з мякінаю, вотруб'ем, як мы разабраліся цяпер, хлеб быў яшчэ і карысны — лячэбны. Як не было хлеба — пяклі скавароднікі, праснакі, каржы з прэснага цеста *(Паводле Я. Сіпакова «Зялёны лісток на планеце Зямля»).*

Працягам тэмы хлеба ў жыцці беларусаў будзе віртуальная экскурсія ў хлебапякарню музейнага комплексу старажытных народных рамёстваў «Дудудкі». На сайце музея (https://dudutki.by/object/94/) распавядаецца пра вялікую колькасць традыцый, звязаных з хлебапячэннем.

Пры падрыхтоўцы меню абеда героя нарыса У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» (заданне 7) рэкамендуецца выкласці яго па наступнай схеме, карыстаючыся пры гэтым інфармацыяй, пададзенай у падручніку «Працоўнае навучанне. Абслуговая праца» (6 клас, с. 13):

Абед.
Закуска (салата).
Суп.
Катлета, мяса.
Гарнір (агародніна, каша).
Салодкая страва (напітак) або сок.

Пры запаўненні табліцы з разлікам прадуктаў, для гатавання стравы варта ўлічваць, што адна порцыя ўключае колькасць адной стравы, разлічанай на спажыванне адным чалавекам (табл. 4).

*Табліца 4*

**Разлік прадуктаў**

| Страва | Колькасць порцый | Аб'ём порцыі ў мілілітрах/грамах |
|---|---|---|
| Суп (боршч) | 3 | 250–300 мл |
| Капуста | | |
| Сала | | |
| Каўбаса смажаная | | |
| Бульба | | |
| Булка | | |
| Хлеб | | |

Дадатковым элементам да меню можа стаць распрацоўка дызайн-меню абеда ў сэрвісе графічнага дызайна Canva (canva.com).

Пры падрыхтоўцы дзённага меню (заданне 8) варта абапірацца на матэрыялы падручнікаў «Працоўнае навучанне. Абслуговая праца» (6, 7, 8, 9 класы). Усю інфармацыю і разлікі зручна афармляць у выглядзе табліц (табліца 5) і спіскаў.

**Дранікі з мясам (калдуны) на 3-4 порцыі**
***Прадукты:***

*Для аладак*
Бульба — 7-8 шт. (1 кг)
Цыбуля — 1 шт.
Мука — 2-3 ст. л.
Яйка — 1 шт.
Перац па смаку
Соль па смаку

*Для фаршу*
Фарш (ялавічына, свініна) — 300 г
Цыбуля — 0,5 шт.
Зяляніна па смаку
Перац па смаку
Соль па смаку

Алей для смажання
Смятана па смаку (для падачы на стол)

***Абсталяванне:***
Патэльня, лапатка сталовая, апрацоўчая дошка, тарка, міска, посуд.

*Табліца 5*

| Грошы, затрачаныя на набыццё прадуктаў, р. | Час гатавання калдуноў (3-4 порцыі) |
|---|---|
| Бульба — 1 р.<br>Цыбуля — 0,40 р.<br>Фарш — 3 р.<br>Мука, перац, соль, смятана, яйка, зяляніна, алей — 2 р. | 30 хвілін<br>(пры ўмове, што фарш ужо гатовы) |
| Разам — 6,40 р. | |

**IV. Праектная дзейнасць** (1 гадзіна).

Праект «Кніга рэцэптаў “Мясцовыя стравы”» можа быць здзейснены як у электроннай версіі, так і на паперы з выкарыстаннем яскравых ілюстрацый.

**V. Прэзентацыя** (1 гадзіна).

Прэзентацыя праекта можа адбывацца ў кабінеце вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» ў выглядзе калектыўнага гатавання адной стравы (па жаданні), рэцэпт якой змешчаны ў кнізе рэцэптаў.

**VI. Рэфлексія.**

Падчас абмеркавання праекта настаўнік прапаноўвае вучням задаць адзін аднаму па пытанні (па ланцужку або ў адвольным парадку). Пажадана, каб пытанні не паўтараліся. Вучням трэба прытрымлівацца толькі аднаго правіла: забараняецца адказваць на пытанне ўголас. Такі падыход здымае напружанасць у калектыве ад страху не адказаць на пытанне. Але важна, каб кожны вучань адказаў на гэта пытанне сам сабе. Настаўнік жа фарміруе праблемнае поле па тэме праекта, што дазваляе планаваць і карэкціраваць змест праекта ў будучыні.

# Модуль 5. На ўсё свае песні: на вяселлі вясельныя, а на хрысцінах хрысцінныя

***Мэта праекта*** — фарміраванне асобы, здольнай адэкватна ўспрымаць і ацэньваць дасягненні мастацка-духоўнай культуры сваёй мясцовасці; шанаванне нацыянальнай культурнай спадчыны; развіццё камунікатыўных навыкаў вучняў.

**I. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці** (1 гадзіна).

Важна разгледзець пытанні для роздуму над праектам.

Вучням прапануецца выканаць заданне 1.

Неабходна зрабіць кароткае падагульненне па пытаннях, прапанаваных у дыдактычных матэрыялах.

Рэкамендуецца абмеркаваць праект, прысвечаны музычна-тэатральнаму дзеянню «Мясцовы абрад», яго асноўныя кампаненты, прэзентацыю і інш.

**II. Збор інфармацыі пра народныя абрады і святы мясцовасці** (1 гадзіна).

У працэсе збору інфармацыі пра народныя абрады і святы мясцовасці ў першую чаргу неабходна абапірацца на фонды школьных, раённых, гарадскіх бібліятэк. Асноўнымі крыніцамі інфармацыі стануць даведачныя выданні (слоўнікі, энцыклапедыі) па беларускім фальклоры, а таксама відэафрагменты абрадаў і свят. Надзвычай карыснымі з'яўляюцца матэрыялы партала #ЭТНАЎСЁ (https://ethno.by/).

Усю літаратуру, падабраную ў заданні 2, можна падзяліць на асноўную і дадатковую. Пасля выканання задання вучням варта абмяняцца інфармацыяй і абмеркаваць, якая літаратура патрапіла ў раздзел асноўнай літаратуры, а якая — дадатковай.

**III. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: музычна-тэатральнае дзеянне «Мясцовы абрад»** (4 гадзіны).

Пры складанні сцэнарыя (заданне 4) рэкамендуецца ўзнавіць правільны парадак дзеянняў у абрадзе пахавання стралы:

1. Выкопванне ямы для стралы.
2. Выкананне спеву з ваджэннем карагодаў.
3. Укладанне ў зямлю лялькі.
4. Закопванне лялькі на ўзмежку жытняга поля.
5. Выкананне спеву «Ты не ўбі, страла».

У ходзе ўрока варта прыгадаць вучням пра тое, што ў Беларусі вядзецца ўлік усіх матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, спіс якіх змешчаны на інфармацыйным партале http://gosspisok.gov.by.

Дадатковым да задання 4 можа стаць складанне карты матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей мясцовасці. Перад гэтым спачатку рэкамендуецца згодна з інфармацыяй дзяржаўнага партала скласці спіс аб'ектаў усіх матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей мясцовасці, якія варта нанесці на карту.

Асобным заданнем можа стаць падрыхтоўка паведамлення пра адну з гісторыка-культурных каштоўнасцей мясцовасці. Калі гісторыка-культурных каштоўнасцей мясцовасці, што цікавяць вучняў, будзе шмат, варта размеркаваць іх паміж імі для самастойнага выканання. Пасля таго як паведамленні будуць зробленыя, неабходна іх паслухаць і абмеркаваць.

Пры выкананні задання 5 настаўнік можа дапоўніць адказы вучняў наступнымі народнымі прыказкамі і прыкметамі:

- ✓ Як на Юр'я раса — хопіць коням аўса.
- ✓ На Юр'я дождж — скаціне лёгкі год, а на грэчку — недарод.
- ✓ Калі на Юр'я мароз, дык будуць добрыя проса і авёс.
- ✓ Як дождж на Юр'я, будзе хлеб і ў дурня.

Пры падрыхтоўцы задання 5 таксама варта пазнаёміцца з жанрам сцэнарыя.

Сцэнарый — гэта загадзя распрацаваны дэталёвы план правядзення якога-небудзь відовішча або культурнага мерапрыемства.

Пры складанні сцэнарыя варта арыентавацца на наступныя яго структурныя кампаненты:

- ✓ дзейныя асобы;
- ✓ кароткае апісанне месца дзеяння;
- ✓ выклад зместу па ролях у выглядзе сюжэтнага плана або схемы.

У якасці ўзору настаўнік можа прапанаваць фрагмент сцэнарыя абраду «Насіць намётку» в. Папшычы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці, што ўваходзіць у дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь:

**Насіць намётку**

***Дзейныя асобы***:

Жыхары вёскі Папшычы (мужчыны, жанчыны, дзеці)

1-я старэйшая жанчына

2-я старэйшая жанчына

*(Усе жыхары вёскі збіраюцца разам каля прыдарожнага крыжа.)*

Мужчыны і жанчыны спяваюць песню «Królu nieba wysokiego».

1-я старэйшая жанчына (ля крыжа звяртаецца да людзей). Вось так калісьці нашыя бацькі казалі: «Халера — была страшнай хваробай!».

2-я старэйшая жанчына (з хваляваннем распавядае). За ноч выткалі палатно з таго, што ў каго было, бо кросны ж былі ва ўсіх. Даўней вакол вёскі была дарога і мы хадзілі па ёй.

*(Жыхары вёскі распласталі палатно і паклалі на яго грашовыя ахвяраванні. Тады з малітвай яны пайшлі працэсіяй да касцёла.)*

1-я старэйшая жанчына. Намётку павінны несці самыя маладыя жыхары вёскі, яе праносяць над маленькімі дзецьмі і іх бацькамі.

2-я старэйшая жанчына. Вось так мы хадзілі вакол вёскі з малітвай і прасілі ў Бога, каб бараніў нас ад страшнай хваробы — халеры.

Пасля выканання задання 5 рэкамендуецца размеркаваць тэкст сцэнарыя «Юр'еўскі карагод» сярод вучняў і прачытаць яго па ролях. Яскрава ўявіць і дакладна зразумець сутнасць гэтага народнага абраду дапаможа яго тэатралізацыя.

Падчас работы на факультатыўных занятках настаўнік можа дадаткова выкарыстаць важную культуразнаўчую інфармацыю.

«Якая птушка — такая і песня», — кажуць людзі. Гэта разумная прыказка а птушчынай песні мае яшчэ большае значэнне для песні людзкой, бо песня людзкая адбівае ў сабе душу чалавека, яго боль і гора, яго патрэбы, жаданні і самае жыццё. Як па твары пазнаюць чалавека, так па песні, асабліва народнай, пазнаецца цэлая нацыя, яе характар і душа. Разам з гэтым песня многа і прынасіла, і прыносіць карысці для народу, яна быццам змяншае людзкія няшчасці, пацяшае ў нядолі, а калі трэба, дык і весяліць. Усім ведама,

што песня — гэта быццам неякая вялікая таемная сіла, вельмі памагала будзіць народ, заахвочваць яго да працы, падымаць з цемнаты, клікаць да свету-навукі, да абароны свайго краю, на добрыя, важныя справы. Дзеля таго ў народаў з шырокай прасветай песня даўным-даўно заваявала сабе пачэснае месца, — яе справядліва шануюць, як вялікі ўсенародны скарб, бо яна для душы кожнага чалавека — ці беднага, ці багатага — так патрэбна, як хлеб і вада для здароўя цела. І нам, беларусам, каб не замерці ў сваім духоўным развіцці, каб вальнейшым часам павесяліцца, набраць сілы да новага жыцця і працы каля народных спраў, — трэба тую песню і музыку, што зрадзілася на народнай ніве, паміж свайго народу, сколькі ёсць сіл трымацца, — не забываць, а цаніць яе так, як вучаць і даюць нам прыклад усе разумнейшыя і практычныя людзі *(Паводле «Хрэстаматыі па гісторыі беларускай мовы»).*

Таксама можна прывесці яшчэ адну надзвычай цікавую і важную культуразнаўчую інфармацыю пра танцавальныя прыхільнасці і традыцыі беларусаў.

Народ Мінскай губерні, ахвотнік патанцаваць, старанна захоўвае свае старадаўнія танцавальныя мелодыі. Вясельны абход або іншыя святы і забавы пачынаюць так званым у народзе танцам у рытме паланэза, які выконваецца некалькімі парамі. Гэты паланэз звычайна доўжыцца хвілін дзесяць ці болей, потым ідзе Круцёлка, што інакш завецца Скакухай, у тэмпе надзвычай жвавага галопу, які танцуюць тыя ж самыя пары; круцяцца кругам або паперамена робяць праходку з хвіліннымі паўзамі, потым вяртаюцца да паланэза. Гэты танец доўжыцца каля паўгадзіны, а іншы раз і болей, у залежнасці ад ступені стомленасці танцораў або музыкантаў.

Поруч са старадаўнімі танцамі, мелодыямі і песнямі, мясцовыя жыхары ў апошнія дваццаць гадоў пачалі танцаваць польку, контрданс, вальс, мазур і кракавяк. Польку танцуюць асабіста спрытна. Гэты танец найбольш упадабаўся мясцовым жыхарам. Контрданс тут таксама танцуюць шмат і з задавальненнем, у пятай фігуры абавязкова ёсць «сола» і яно звычайна бывае ўзнагароджана апладысментамі гледачоў, калі танцор пакажа які-небудзь спрытны зварот. Мясцовыя жыхары, старанна захоўваючы свае старадаўнія танцы і мелодыі, значна меней кансерватыўныя ў адзенні. Ахвотна замяняюць даўнія доўгія сярмягі на сюртукі, банжуркі, буркі або паліто з шэрага сукна. Моладзь прыходзіць на танцы звычайна ў сюртуках, часам у чорных суконных. Жанчыны замяняюць даўнія гарсэты на паркалёвыя сукенкі і так званыя кофтачкі, а ў прычосцы імкнуцца наследаваць вышэйшаму класу, як і дробнапамесная шляхта. Часта так прыгожа апрануты і танцуюць так спрытна, што маглі б танцаваць у любым вышэйшым свеце. Сяляне, якія ходзяць на службу ў горад, прыносяць адтуль мадэлі касцюмаў і новыя танцы *(Паводле М. Ельскага «Народныя танцы Мінскай губерні»).*

Пры выкананні задання 7 настаўніку варта абапірацца на танцавальны і песенны матэрыял, змешчаны ў фалькларных зборах і інтэрнэт-рэсурсах («Ох, і сеяла Ульяніца лянок», «Па саду дзека гуляла», «Бычок», «Журавель», «Козачка»; танец і прыпеўкі: «Таўкачыкі» і г. д.).

Перад тым як развучваць песню ў заданні 8, рэкамендуецца яе праслухаць у некалькіх выканальніцкіх версіях: у аўтэнтычнай версіі ў выкананні носьбітаў традыцыі або калектываў народнай музыкі, якія прапагандуюць нацыянальныя традыцыі.

***Алгарытм развучвання народнай песні***

1. Чытанне слоў спеву.
2. Спеў мелодыі песні настаўнікам.
3. Спеў мелодыі песні настаўнікам і вучнямі ў інструментальным суправаджэнні.
4. Спеў песні вучнямі ў інструментальным суправаджэнні (або a capella).
5. Спеў песні з элементамі тэатралізацыі.

Надзвычай каштоўнай для атрымання вучнямі вопыту правядзення забаўляльных мерапрыемстваў стануць музейна-педагагічныя заняткі і інтэрактыўныя праграмы. Напрыклад, вартыя ўвагі праграмы «Сеў хлопчык з шкляначкай ля вулічнага ганку» або «Сам зраблю батлеечную ляльку» музея «Беларуская хатка» (http://belhatka.bellit.museum.by/), якія знаёмяць з дзіцячымі забавамі часоў М. Багдановіча і музейным прадметам «батлеечная лялька» адпаведна.

**IV. Праектная дзейнасць** (2 гадзіны).

Пры падрыхтоўцы музычна-тэатральнага дзеяння мясцовага абраду спачатку рэкамендуецца скласці сцэнарый тэатральнага свята. Для гэтага важна напісаць яго сюжэтную лінію са спісам сцэн і дзеянняў. Варта разумець, што гэта толькі накіды музычна-тэатральнага дзеяння, якія ў працэсе сваёй падрыхтоўкі будуць перапрацаваны або відазменены згодна з выканальніцкімі магчымасцямі вучняў.

Найбольш яскравымі атрымліваюцца тыя сцэнарыі, якія заснаваны на ўжо вядомых літаратурных, сцэнічных, кінематаграфічных матэрыялах. А калі спалучаецца некалькі твораў розных жанраў і стыляў, гэта выклікае асаблівую цікавасць у вучняў. Так, напрыклад, сучасны папулярны кінафільм можна прапусціць скрозь фільтр фальклорнага мастацтва і надаць вобразам любімых герояў мясцовы каларыт праз выкарыстанне народных прымавак, спеваў, яскравых маналогаў. Цікавай знаходкай будзе стварэнне працягу вядомага твора або яго сучаснае апрацаванне з выкарыставаннем сучаснай лексікі.

Пасля таго як будзе складзена сюжэтная лінія і падрыхтаваны спіс сцэн і дзеянняў, варта размеркаваць ролі сярод вучняў з улікам іх уласнай зацікаўленасці і гатоўнасці выступіць у той ці іншай ролі. Дапамогай настаўніку могуць быць дзеці, якія займаюцца ў музычных і танцавальных кружках, здольныя ўзяць на сябе смеласць па падрыхтоўцы танцавальных і музычных нумароў. Вялікае значэнне ў поспеху музычна-тэатральнай пастаноўкі маюць рэпетыцыі, на якія варта сфакусіраваць асаблівую ўвагу. Таму рэкамендуецца заахвоціць вучняў да заняткаў дома.

**V. Прэзентацыя** (1 гадзіна).

Праект «Музычна-тэатральнае дзеянне “Мясцовы абрад”» можа быць здзейснены ў межах правядзення музычна-забаўляльных мерапрыемстваў установы адукацыі; зімовых, веснавых свят, а таксама разнастайных канцэртаў.

Вынікі праекта могуць быць прадстаўлены на раённых конкурсах дзіцячай творчасці, фестывалях.

**VI. Рэфлексія.**

Пры правядзенні рэфлексіі мэтазгодна карыстацца інтэрактыўным метадам «Спытай настаўніка». Вучні запісваюць на адным аркушы пытанне, а на другім — адказ на яго. Аркушы з пытаннямі вучні аддаюць настаўніку, пакідаючы ў сябе паперы з адказамі на іх. Настаўнік чытае пытанне і, па жаданні, адказвае на яго. Вучні параўноўваюць адказ настаўніка з адказам на пытанне, змешчаным на аркушы. Калі адказ вучня не супаў (або супаў часткова) з адказам настаўніка, варта карэкціраваць уяўленне і ўспрыняцце вучня па гэтай тэме.

## ПРЫКЛАДНАЕ ТЭМАТЫЧНАЕ ПЛАНАВАННЕ

(2-і год навучання, 35 гадзін)

| № модуля | Назва модуля | Колькаць гадзін | Віды дзейнасці |
|---|---|---|---|
| 6 | Добрая дарога — карацейшы шлях | 8 | Пошук інфармацыі; аналіз літаратурных тэкстаў; фармуляванне і аргументацыя ўласнай пазіцыі на паняцці, падзеі, з'явы; складанне плана-схемы; падрыхтоўка тэксту экскурсіі; падбор дадатковых матэрыялаў да экскурсіі |
| 7 | Добрая слава далёка чуваць | 7 | Пошук інфармацыі; аналіз літаратурных тэкстаў; абмеркаванне тэкстаў маральнай тэматыкі; выкананне творчых заданняў; работа з табліцамі; падрыхтоўка інструкцыі |
| 8 | Чалавек жыве век, а добрае дзела — два | 11 | Пошук інфармацыі; аналіз атрыманай інфармацыі і крытычнае выкарыстанне яе з мэтай стварэння рэкламнага прадукту; падрыхтоўка карты транспартных шляхоў па збыту прадукцыі прадпрыемства; складанне дыяграм, схем, разлікаў; падрыхтоўка паведамлення пра працоўныя дынастыі прадпрыемства / рэгіёна / уласнай сям'і |
| 9 | На добрай зямлі добрая надзея | 9 | Пошук інфармацыі; работа з табліцамі; аналіз дыяграм; складанне графікаў і прагнозаў; падрыхтоўка спіса перспектыўных прафесій; падбор ілюстрацый |

# Модуль 6. Добрая дарога — карацейшы шлях

***Мэта праекта*** — фарміраванне ў вучняў асноў патрыятызму; выхаванне гуманістычных адносін да навакольнага свету, любові і павагі да культурна-гістарычнай спадчыны сваёй Радзімы; развіццё зацікаўленасці гісторыяй роднага краю і мясцовымі славутасцямі.

**I. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці** (1 гадзіна).

Важна разгледзець пытанні для роздуму над праектам.

Падчас абмеркавання тэмы праекта настаўнік можа паразважаць з вучнямі пра краязнаўства, пры гэтым дадаткова выканаць наступнае заданне:

Выберыце правільнае значэнне слова «краязнаўства»:

1) вывучэнне пэўнай тэрыторыі і накапленне ведаў пра яе;

2) аб’ектыўнае апісанне фактаў і паслядоўнае выкладанне падзей пра мінулае мясцовасці;

3) даследаванне культурна-побытавых асаблівасцей народа мясцовасці, а таксама яе матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Перад выкананнем задання 1 рэкамендуецца пазнаёміцца з наступнай інфармацыяй:

Экскурсія прадугледжвае наведванне славутых мясцін з адукацыйнай, навуковай, спартыўнай або забаўляльнай мэтамі. У сучасных умовах тыпавыя экскурсіі павінны мець нестандартны характар. Экскурсію можна напоўніць гульнямі, загадкамі, галаваломкамі, заданнямі з нестандартнымі рашэннямі; усім тым, што можа выклікаць асаблівую цікавасць. Элементы квэста могуць стаць асновай для распрацоўкі маршруту нестандартных экскурсій.

Вучням прапануецца выканаць заданне 1. Правільныя адказы:

**Напрамкі краязнаўчай работы**

Змест краязнаўчай работы па вывучэнні прыродных асаблівасцей мясцовасці прадугледжвае вывучэнне геалагічнай будовы, рэльефу, унутраных водаў, раслiннага і жывёльнага свету, праблем аховы прыроды.

Змест краязнаўчай работы па вывучэнні гістарычных асаблівасцей мясцовасці прадугледжвае вывучэнне гісторыі краю, даследаванне археалагічных і гістарычных помнікаў, вывучэнне лёсу вядомых людзей.

Змест краязнаўчай работы па вывучэнні культурных асаблівасцей мясцовасці прадугледжвае вывучэнне яе матэрыяльнай (збудаванні, прылады працы, адзенне, нацыянальная кухня) і духоўнай культуры (літаратура, фальклор, мастацтва, традыцыі і звычаі).

Можна прапанаваць выканаць творчае заданне — сінквейн.

Сінквейн складаецца з 5 радкоў.

1. Адзін назоўнік або займеннік (тэма, аб’ект, прадмет).
2. Два прыметнікі або дзеепрыметнік (апісанне прымет або якасцей прадмета або аб’екта).
3. Тры дзеясловы або дзеепрыслоўі, якія апісваюць характэрныя дзеянні аб’екта.
4. Спалучэнне слоў, у якім выказваюцца адносіны аўтара да прадмета або аб’екта.
5. Заключны назоўнік, які характарызуе сутнасць прадмета або аб’екта.

Напрыклад,
Край
Родны, цудоўны
Натхняе, спрыяе, зачароўвае
Дзе нарадзіўся, там і згадзіўся
Радзіма

Настаўніку варта выразна прачытаць верш Якуба Коласа [8]:

***

Многа слаўненькіх куточкаў
Ёсць у нашым краі,
Дзе пад гоман ручаёчкаў,
Пад шум дрэў у гаі
Рой журботных дум пакінеш;
Дзе няма трывогі,
Дзе душою адпачынеш,
Змучаны з дарогі;
Дзе прыемны ветрык млее,
Збажыну калыша,
Дзе пакоем-згодай вее
Дзе ўсё шчасцем дыша.

*Якуб Колас.*

Пасля дэкламацыі настаўнік задае пытанні:

— Якія пачуцці, думкі выклікаюць у вас гэтыя радкі?

— Наколькі блізкія вам адносіны Якуба Коласа да роднага краю?

Рэкамендуецца зрабіць кароткае падагульненне па пытаннях, прапанаваных у дыдактычных матэрыялах.

Важна пры выбары аб’екта экскурсійнага маршруту абапірацца на яго пазнавальную каштоўнасць, вядомасць, незвычайнасць, выразнасць, захаванасць і ўдалы час паказу.

**II. Збор інфармацыі па экскурсійным маршруце мясцовасці** (1 гадзіна).

Пры распрацоўцы маршруту экскурсіі могуць быць выкарыстаны наступныя крыніцы інфармацыі: дзяржаўныя і музейныя архівы, хроніка-дакументальныя і навукова-папулярныя крыніцы. Неабходна ўлічваць, што выбраная інфармацыя павінна пацвярджацца адпаведнай дакументацыяй. Таксама прыдатнай могуць стаць мультымедыйныя энцыклапедыі, карыстацца якімі можна з дапамогай даступных гаджэтаў.

У якасці метадаў збору даных настаўнік можа прапанаваць прааналізаваць тэкставыя дакументы і ілюстрацыі; выкарыстаць інтэрв’ю з вядомымі асобамі, падзеі і факты гісторыі (матэрыялы серыі кніг «Памяць. Хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі»).

Вучням прапануецца выканаць заданне 2.

У ходзе распрацоўкі маршруту экскурсіі складаецца спіс кніг, брашур, артыкулаў, апублікаваных у газетах і часопісах. Складзены бібліяграфічны спіс дазваляе вызначыць прыкладны аб’ём работы па вывучэнні літаратурных крыніц, якія дапамогуць у далейшым выкарыстоўваць неабходны фактычны і тэарэтычны матэрыялы пры падрыхтоўцы тэксту экскурсіі.

**III. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: экскурсійны маршрут «Па мясцовых славутасцях»** (3 гадзіны).

Пры выкананні пісьмовай часткі задання 3 па складанні тэксту легенды варта ўлічваць наступныя патрабаванні да яго:

сцісласць выкладання;
дакладнасць фармуліровак;
паслядоўнасць і паўнату выкладання;
поўнае адлюстраванне легенды.

Узорам для выканання задання 4 можа стаць запоўненая табліца з характарыстыкай ракі Сэрвач (табл. 6).

*Табліца 6*

| | |
|---|---|
| **Назва ракі** | Сэрвач |
| **Выток** | возера Сэрвач |
| **Даўжыня (агульная і, калі вядома, на тэрыторыі вашага раёна)** | 85 км |
| **Населеныя пункты на рацэ** | гарады Вілейка, Вільнюс, Каўнас; аг. Будслаў; г. п. Гарадзішча; вёскі Ясянец (Баранавіцкі раён), Беразавец, Панямонь, Сёгда, Карчоўка |
| **Прытокі** | левыя прытокі: Ашмянка, Вільня, Газоўка, Дзвінаса, Дразда, Ілія, Кабылянка, Крайшчанка, Паўпе, Смердзія, Уша, Кужэц, Оксна, Усцізеркі.<br>правыя прытокі: Балошынка, Белавароціца, Дудка, Жэймяна, Кямеліна, Лонва, Палавойка, Пела, Нарач, Сарачанка, Сластаўка, Спорня, Страча, Сянканка, Сярчыстая, Швянтойі |
| **Вусце** | Вілія (Вілейскае вадасховішча) |
| **Гаспадарчае выкарыстанне** | торфаздабыча, лесакарыстанне, выпас жывёлы, сенакашэнне, вырошчванне прапашных культур |
| **Экалагічны стан** | забруджванне вады возера стокамі з узараных схілаў; асушэнне тэрыторыі для здабычы торфу; выпальванне расліннасці ў веснавы перыяд, асабліва ў сухое надвор'е, наносіць істотную страту біялагічнай разнастайнасці |

У заданні 5 пры складанні схематычнага плана гарадзішча Ракава рэкамендуецца ўлічваць напрамкі свету, спецыфічную форму гарадзішча і разнастайныя асаблівасці размяшчэння, па-магчымасці адлюстроўваючы іх з улікам прапорцый. Пры гэтым пры абазначэнні разнастайнай расліннасці або іншых аб'ектаў варта карыстацца агульнапрынятымі ў геаграфіі схематычнымі абазначэннямі.

Пры разглядзе адзінак вымярэння даўжыні, якімі карысталіся нашы продкі, варта выкарыстаць кнігу: К. Скурат. «Даўнія беларускія меры» [16].

Артысты, вучоныя, музыканты, мастакі, літаратары, якія ў розныя часы былі звязаны з Ракавам: Міхал Грушвіцкі, Уры Гіршавіч Фінкель, Мікалай Мяцельскі, Рыгор Шацько, Валяр'ян Янушкевіч, Фелікс Янушкевіч, Язэп Янушкевіч, Вячаслаў Рагойша.

Дадатковым матэрыялам да задання 6 могуць стаць матэрыялы, змешчаныя на партале дзяржаўнай установы культуры «Раённы музейны комплекс імя Напалеона Орды» (http://napoleon.museum.by). Цікавым дапаўненнем да музейнага рэсурсу стане фільм Алега Лукашэвіча «Напалеон Орда», дзе можна пазнаёміцца з фактамі біяграфіі, музычнымі творамі кампазітара і яго нашчадкамі. Акрамя таго, карыснымі для знаёмства з творчасцю Н. Орды могуць стаць матэрыялы заняткаў вучэбнага прадмета «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» (9 клас).

Пасля таго як будуць падабраны фотаздымкі мясцовасці (пункт 2 задання 6), можна арганізаваць фотаконкурс з наступным вылучэннем пераможцаў.

Пытанні задання 7 выконваюцца паступова, непасрэдна падчас работы над праектам.

Сярод мастацкіх прыкладаў настаўніку варта ўзгадаць і звярнуцца да паэтычнага зборніка А. Астрэйкі «Слуцкі пояс», апавядання М. Чарняўскага «Слуцкія паясы», карціны М. Блішча «Слуцкія ткачыхі», скульптуры С. Гумілеўскага «Адраджэнне слуцкага пояса», а таксама паштовых марак, канвертаў і манет.

Паведамленне пра аднаго з беларускіх дзеячаў, пададзеных у тэксце А. Ельскага, можна падрыхтаваць па наступным плане:

1) гады жыцця і творчасці;
2) значныя звесткі пра жыццё;
3) мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю;
4) дзейнасць, яе значэнне;
5) уклад у нацыянальную культуру.

Схема плана можа быць дапоўнена або зменена пры жаданні.

Пры выкананні задання настаўніку варта звярнуць увагу на асобу Аляксандра Ельскага — беларускага гісторыка, літаратуразнаўца, краязнаўца, публіцыста, паэта, перакладчыка, збіральніка беларускіх рукапісаў. Варта пазнаёміцца з яго эпісталярнай спадчынай.

**Яну Карловічу**

З Замосця, 1890 г. 5/17 лютага

Шаноўны мой зямляча!

Пасылаючы Вам прывітанне, прашу ласкава прыслаць мне кнігу пана Ул. Вярыгі[1] з Вашай прадмовай: «Беларускія паданні», якая толькі што выйшла ў Львове. Я рупліва збіраю ўсё, што датычыць беларускай літаратуры, і хацеў бы мець названую кніжку, якую цяжка дастаць у краі. Кошт яе верну Вам са шчырай удзячнасцю.

Цісну высакародную Вашу далонь.

Адданы слуга і зямляк

А. Ельскі.

P.S. Некалькі месяцаў назад мяне запрасіла супрацоўнічаць рэдакцыя толькі што адкрытай Вялікай усеагульнай энцыклапедыі[2], дзейным членам камітэта якой з'яўляецеся, як я чытаю, і Вы. Паслаў рэдакцыі пару артыкулаў на «А», менавіта: «Аўраам Парахоўнік», «Альба», «Адамарын», і пры гэтым спіс тэм, якія я мог бы апрацаваць. Не атрымаўшы да гэтага часу з рэдакцыі ніякага адказу, ці павінен заняцца работай для энцыклапедыі, дзе я мог бы змяшчаць пераважна мінскія матэрыялы, якія датычаць гісторыі, геаграфіі, біяграфій і г. д., а для гэтага ў мяне ёсць шмат цікавага і зусім не выкарыстанага ў ранейшых энцыклапедыях матэрыялу.

Высветліце для мяне гэта пытанне, а калі можна, то зрабіце і пратэкцыю для майго супрацоўніцтва, бо я хацеў бы родныя рэчы захаваць для сваіх суайчыннікаў. Для геаграфічнага слоўніка[3] я апрацаваў звыш 7 тысяч апісанняў, а ўсе мае манаграфіі ў слоўніку перавышаюць лічбу 10 тысяч. Няхай бы і ў энцыклапедыі мая любая Міншчына мела ў маёй асобе свайго прадстаўніка. Звыш трыццаці год я шчыра працаваў над тым, каб грунтоўна пазнаць асабліва гэту частку краіны. Гэта ж ва ўсіх адносінах калыска нашай нацыянальнай славы! Выкрасліць Міншчыну, дык што ж застанецца? І сапраўды, ці не засмелая мая заўвага. Аднак жа Вы мяне зразумееце!

А. Ельскі.

---

[1] Вярыга Уладзіслаў — польскі філосаф і энограф. Збіраў беларускі фальклор, у 1889 г. выдаў у Львове кнігу «Беларускія паданні» (з прадмовай Я. Карловіча).

[2] Вялікая агульная ілюстраваная энцыклапедыя.

[3] «Геаграфічны слоўнік Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краёў».

Пры падрыхтоўцы паведамлення ў заданні 8 настаўніку варта звярнуць увагу на яго фармулёўку. Тэкст павінен выяўляць індывідуальнасць: вызначаць пункт гледжання на факты і з'явы, якім прысвечаны экскурсійны маршрут, даваць аб'ектыўную адзнаку аб'ектам.

**IV. Праектная дзейнасць** (2 гадзіны).

Пры складанні маршруту экскурсіі «Па мясцовых славутасцях» варта ўлічваць зручнасць шляху праходжання ўсяго маршруту, а таксама ўзроставыя асаблівасці групы, для якой плануецца экскурсійны маршрут. Кожны маршрут павінен быць бяспечны для экскурсантаў і праходзіць у тых месцах, дзе ёсць неабходная інфраструктура для рэалізацыі экскурсіі.

Надзвычай важным этапам складання экскурсійнага маршруту з'яўляецца падрыхтоўка тэхналагічнай карты экскурсіі, якая ўключае прасторавыя і часавыя характарыстыкі асобных этапаў экскурсіі. Яе варта запоўніць па наступнай схеме:

маршрут;
адлегласць (км);
працягласць па часе;
месцазнаходжанне прыпынкаў;
аб'екты агляду.

Рэкамендуецца пазначыць усе дэталі маршруту з уключэннем інфармацыі па правілах бяспекі. Прапісваецца часавы рэгламент для кожнай з падтэм. Даюцца ўказанні па месцах прыпынку на маршруце, самастойнай рабоце экскурсантаў.

Таксама неабходна падрыхтаваць пашпарт экскурсійнага аб'екта (помніка), які ўключае:

1) назву помніка (першапачатковая і сучасная, а таксама назва, распаўсюджаная сярод насельніцтва);
2) гістарычная падзея, з якой звязаны помнік (дата падзеі);
3) месцазнаходжанне аб'екта;
4) апісанне аб'екта;
5) крыніцы інфармацыі пра аб'ект (літаратура, архіўныя даныя, вусныя паданні);
6) стан аб'екта;
7) дата складання пашпарта, прозвішча складальніка.

Тэкст экскурсіі ўяўляе сабой матэрыял, неабходны для поўнага раскрыцця ўсіх падтэм, якія ўваходзяць у экскурсію. Варта будаваць тэкст, абапіраючыся на літаратуру і факталагічныя даныя, падмацаваныя крыніцамі. Важнымі складнікамі тэксту экскурсіі з'яўляюцца ўступ, заключэнне, а таксама лагічныя пераходы з адной падтэмы да другой. Працягласць тэкставага матэрыялу кожнага прадстаўленага аб'екта не павінна быць доўгай (5–7 хвілін), каб максімальна зацікавіць і не стаміць экскурсантаў.

Для экскурсіі рэкамендуецца падрыхтаваць «партфель экскурсавода», які ўключае разнастайныя наглядныя матэрыялы, неабходныя для правядзення экскурсіі з патрэбнымі тлумачэннямі і каментарыямі.

Карысным будзе запаўненне наступнай табліцы (табл. 7).

*Табліца 7*

**Экскурсійны маршрут**

| № п/п | Фотаздымкі краявідаў, гістарычных помнікаў, партрэты знакамітых асоб, карты і інш. | Назва аб'екта | Апісанне аб'екта |
|---|---|---|---|
| | | | |

**V. Прэзентацыя** (1 гадзіна).

Прэзентацыя экскурсійнага маршруту «Па мясцовых славутасцях» можа праходзіць у традыцыйнай форме. Разам з тым яна можа быць рэалізавана і віртуальна: з выкарыстаннем мультымедыйных тэхналогій, падрабязных каментарыяў пра аб'екты маршруту, калі ў інтэрактыўным рэжыме даецца падрабязная тэкставая і наглядная інфармацыя.

Матэрыялы выніковага прадукту створаць аснову для шырокай прапаганды гісторыка-культурнай спадчыны, могуць актыўна выкарыстоўвацца ў экскурсійнай дзейнасці рэгіёна.

Асабліва карысным для маральнага выхавання вучняў стане арганізацыя шэфства вучняў над помнікам архітэктуры, якому быў прысвечаны праект.

**VI. Рэфлексія.**

— Чаму ўзнікае патрэбнасць вывучаць і даследаваць свой край, ствараць школьныя музеі, праводзіць асветніцкую работу па гэтай тэме?

— Якія задачы вырашалі? Што не атрымалася і чаму?

— Што варта рабіць для ўзбуджэння цікавасці да гісторыі і культуры сваёй мясцовасці?

# Модуль 7. Добрая слава далёка чувакць

***Мэта праекта*** — фарміраванне сістэмы маральных каштоўнасцей вучняў на аснове маральнага ўзору знакамітай асобы мясцовасці; развіццё ўстойлівасці маральных якасцей вучняў; умацаванне навыкаў маральна-этычных норм паводзін вучняў у паўсядзённым жыцці.

**I. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці** (1 гадзіна).

Важна разгледзець пытанні для роздуму над праектам.

Заданне 1 накіравана на развіццё ўменняў вучняў вылучаць характарыстыкі знакамітай асобы.

Пасля таго як вучні вызначацца са знакамітай асобай, якой будзе прысвечаны праект, варта засяродзіць іх увагу на тых якасцях, што вылучаюць яе сярод шэрага жыхароў іх мясцовасці.

Неабходна зрабіць кароткае падагульненне па пытаннях, прапанаваных у дыдактычных матэрыялах.

**II. Збор інфармацыі пра факты з жыцця знакамітай асобы** (1 гадзіна).

У працэсе збору інфармацыі пра факты з жыцця знакамітай асобы ў першую чаргу неабходна абапірацца на фонды школьных, раённых, гарадскіх бібліятэк. Асноўнымі крыніцамі інфармацыі стануць даведачныя выданні: энцыклапедыі, даведнікі, часопісы, газеты. Акрамя таго, мэтазгодна карыстацца магчымасцямі інтэрнэт-рэсурсаў: віртуальных музеяў, архіваў, бібліятэк, тэатраў і г. д.

Перад выкананнем задання 2 вучням можна прапанаваць сістэматызаваць усе знойдзеныя пра знакамітую асобу крыніцы інфармацыі па наступным прыкладзе:

***Артыкулы ў энцыклапедычных выданнях***

*1. Данцыг Май Вольфавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1996—2004. — Т. 6. — С. 528.*

*2. …*

*3. …*

***Артыкулы ў часопісах***

1. Шаранговіч, Н. Мастак, улюбёны ў Мінск / Н. Шаранговіч // *Беларусь. — 2001. — № 9.*

*2. …*

*3. …*

***Артыкулы ў інтэрнэт-рэсурсах***

*1. Данцыг без эскізаў [Электронны рэсурс] // Культура. — № 22. — 30.05.2015–05.06.2015. — Рэжым доступу : http://kimpress.by/index.phtml?page=2&id=11619. — Дата доступу : 08.12.2022.*

*2. …*

*3. …*

Заданне 2 вучні выконваюць самастойна, пасля чаго адбываецца калектыўны абмен інфармацыяй.

Заданне 3 накіравана на развіццё ўменняў правільна і ёмка фармуляваць пытанні, якія раскрываюць сутнасць творчай дзейнасці знакамітай асобы, асвятляюць важныя факты біяграфіі, вызначаюць адметныя асаблівасці асобы. У якасці ўзору настаўнік можа прапанаваць прыкладныя пытанні, якія могуць быць выкарыстаны ў ходзе інтэрв'ю:

— Калі вы зразумелі, што будзеце прафесійна займацца спевамі?
— У чым заключаецца работа галоўнага хормайстра?
— Чыё меркаванне, што датычыць прафесіі, для вас з'яўляецца аўтарытэтным?
— Якіх крытэрыяў вы прытрымліваліся, калі стваралі харавы калектыў?
— Як мянялася ваша нервовая сістэма за 35 гадоў кіравання харавым калектывам?
— Чаму навучылі вас артысты хора за 35 гадоў?
— Чаго вы стараецеся не дапускаць у адносінах да спевака?
— Чаго вы не зможаце дазволіць у адносінах да сябе з боку спевакоў хору?
— У чым перавага хормайстра-жанчыны?
— Што для вас азначае званне народнай артысткі Беларусі? *(Паводле А. Вайткуна, інтэрв'ю з Нінай Іосіфаўнай Ламановіч, народнай артысткай Беларусі, галоўным хормайстрам Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.)*

Пры чытанні табліцы (заданне 4) вучням неабходна карэкціраваць назву 3-й калонкі (музычныя творы, паэтычныя творы і г. д.), згодна з характарам творчай дзейнасці знакамітай асобы, якой будзе прысвечаны праект. Вучням рэкамендуецца запоўніць табліцу. На аснове інфармацыі, пададзенай у табліцы, вучням варта падрыхтаваць вуснае выказванне пра лёсавызначальныя этапы жыцця і творчасці знакамітай асобы.

**III. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: партрэтны нарыс знакамітай асобы мясцовасці** (2 гадзіны).

Мяркуецца форма рэалізацыі праекта — партрэтны нарыс. Мэтазгодна пазнаёміцца з тэарэтычнымі асновамі напісання партрэтнага нарыса.

У цэнтры ўвагі партрэтнага нарыса выступае асоба. Сутнасць партрэтнага нарыса заключаецца ў тым, каб расказаць і паказаць, якім каштоўнасцям служыла знакамітая асоба, у чым бачыла мэту свайго жыцця. Варта не канстатаваць дзеянні і факты, але паказваць, якім чынам адбывалася адстойванне маральных каштоўнасцей, якія цяжкасці пры гэтым сустрэліся і як іх пераадольваць. Апісанне гэтай «барацьбы», дзеянняў, учынкаў і з'яўляецца раскрыццём характару знакамітай асобы.

Неад'емным кампанентам нарыса з'яўляюцца адказы на пытанні: Што адбываецца? Дзе адбываецца? Як да гэтага ставіцца? Добра гэта ці не? Што трэба рабіць? Як выправіць сітуацыю?

Пасля знаёмства з тэарэтычным матэрыялам па структуры партрэтнага нарыса, літаратурнай мове і спецыфічным асаблівасцям жанру, яго зместавым напаўненні вучні павінны вызначыць найбольш цікавыя факты біяграфіі знакамітай асобы. Асаблівую ўвагу неабходна надаць тым маральным якасцям знакамітай асобы, якія паўплывалі або выпрацаваліся на працягу яе станаўлення на пэўных этапах жыцця і дзейнасці. Настаўнік можа дапамагчы вучням і задаць пытанні:
— Якія мэты ставіла перад сабой знакамітая асоба?
— Якія цяжкасці пры гэтым пераадольвала?
— Якія дзеянні або ўчынкі знакамітай асобы раскрываюць яе характар?

Заданне 5 накіравана на развіццё ўмення аналізу энцыклапедычнага артыкула, яго стылістычных асаблівасцей, лексічнага складу, граматычных адметнасцей. План артыкула вучні складаюць самастойна, пасля чаго адбываецца калектыўная праверка правільнасці выканання задання. Можа быць прапанаваны дэфармаваны план, у якім прапануецца аднавіць правільную паслядоўнасць:

1. Тэатральныя ролі І. Буйніцкага.
2. Месца нараджэння І. Буйніцкага.
3. Першая беларуская трупа.
4. Характарыстыка творчасці І. Буйніцкага.

Калі ў заданні 5 вучням прапанаваны энцыклапедычны артыкул, то ў заданні 6 змешчаны навукова-папулярны. Лагічным працягам работы з тэкстам з'яўляецца іх стылістычнае параўнанне. Рэкамендуецца прапанаваць вучням крытэрыі для параўнання: лексіка, змест.

Карыснымі для знаёмства з творчасцю І. Буйніцкага могуць стаць матэрыялы заняткаў вучэбнага прадмета «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» (9 клас).

Пры складанні слоўнага партрэта (заданне 7) варта прапанаваць вучням прытрымлівацца наступнага алгарытму:

1) агульнае ўражанне ад фотаздымка;
2) апісанне знешнасці (вачэй, твару, вуснаў, фігуры);
3) апісанне эмацыянальнага стану;
4) апісанне рыс, што адлюстроўваюць індывідуальнасць знакамітай асобы (вопратка, фрызура (прычоска), паводзіны).

Вучні выконваюць заданне ў групах (парах) з наступнай праверкай і дапаўненнем. Найбольш трапныя эпітэты запісваюць у сшытак.

Прапанаваны ў заданні 8 тэкст рыхтуе вучняў да выканання творчага задання «Як стаць знакамітым урачом». Перад тым, як вучні прыступяць да задання па падрыхтоўцы інструкцыі, настаўнік павінен звярнуць іх увагу на апорныя словы, якія звычайна ўжываюцца ў пабудове інструкцый (трэба, неабходна, павінны), а таксама дзеясловы, што выкарыстоўваюцца ў пачатку сказа.

Пасля таго як інструкцыя будзе складзена, прапануецца адказаць на пытанне:

— Ці гарантуе выкананне інструкцыі атрыманне статуса «знакаміты ўрач»?

**IV. Праектная дзейнасць** (2 гадзіны).

Напісанне партрэтнага нарыса у «Краязнаўчую газету» пра знакамітую асобу рэгіёна павінна быць заснавана на тых літаратурных і ілюстратыўных матэрыялах, якія былі знойдзены вучнямі падчас работы з рознымі крыніцамі. Напісанне нарыса мэтазгодна ажыццяўляць па блоках, раздзяліўшы функцыі па напісанні кожнага блока сярод вучняў. Пасля падрыхтоўкі і прэзентацыі асобных фрагментаў нарыса адбываецца іх абмеркаванне і фіксацыя правак.

**V. Прэзентацыя праекта** (1 гадзіна).

Прэзентацыя праекта можа праходзіць у форме сустрэчы са знакамітай асобай або яе нашчадкамі.

**VI. Рэфлексія.**

Пры правядзенні рэфлексіі настаўнік можа прапанаваць вучням выказаць свае ўражанні ад знаёмства са знакамітай асобай, свае адносіны да яе, выкарыстаўшы наступныя фразеалагізмы: *у мяне адчыніліся вочы…, мяне закранула за жывое…, з заміраннем сэрца я…, з затоеным дыханнем я…, мая душа не прымае…, ад усяго (шчырага) сэрца я…, я акунуўся з галавой…, я з'еў бы пуд солі…*

Пры апавяданні пра знакамітую асобу карыснымі могуць быць наступныя фразеалагічныя абароты: *ён асядлаў Пегаса, баявое хрышчэнне, добры геній, узяў сябе ў рукі, блукáў па пакутах, Божай міласцю, браць прыклад, узяць быка за рогі, закладаў фундамент (асновы), складае залаты фонд, іграў першую скрыпку, з Божай ласкі, крок за крокам, іскра Божая, з лёгкай рукі, на першы план, на сваім месцы, нёс свой крыж, па гарачых слядах, першая ластаўка, прайсці агонь і ваду,*

*праклаў дарогу (шлях, сцежку), яго пуцёўкай у жыццё, яго пуцяводнай зоркай, ён сам-насам сустрэўся, ён стаяў на сваім, трымаў сваё слова, увайшоў у гісторыю, чырвонай ніткай праходзіць.*

Пры адказе на пытанне «Што для сябе вы ўзялі са знаёмства са знакамітым чалавекам?» вучням можна прапанаваць выкарыстаць беларускія прыказкі, якія могуць выяўляць каштоўнасныя маральныя арыенціры знакамітай асобы, вартыя для наследавання:

- ✓ Маладыя ад старых вучацца.
- ✓ Не па лесу ходзіць навука, а па людзях.
- ✓ Ад навукі дужэюць (спрытнеюць) рукі.
- ✓ Хочаш многа знаць — трэба мала спаць.
- ✓ Разумны ведамі не выхваляецца.
- ✓ Добра таго вучыць, хто хоча ўсё знаць.
- ✓ Будзем вучыцца, пакуль смерць лучыцца.

# Модуль 8. Чалавек жыве век, а добрае дзела — два

***Мэта праекта*** — фарміраванне актыўнай пазіцыі вучняў і іх лідарскіх якасцей (рашучасці, ініцыятыўнасці, настойлівасці ў дасягненні мэты); развіццё даследчых, самаацэначных і рэфлексіўных навыкаў; выхаванне паважлівых адносін да працы і да людзей працы.

**I. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці** (1 гадзіна).

Важна разгледзець пытанні для роздуму над праектам.

Пры абмеркаванні тэмы праекта настаўнік просіць вучняў выказацца. Варта ўзгадаць прыказкі, якія адлюстроўваюць тэму праекта.

Рэкамендуецца абмеркаваць словы Сяргея Грахоўскага «Жыві, шукай, усё рабі як след, каб на Радзіме твой свяціўся след» і выказаць уласную пазіцыю на гэта меркаванне.

Вучням прапануецца выканаць заданне 1.

Дадатковай ілюстрацыяй да разумення працавітасці беларускага народа стане верш Максіма Лужаніна «Мая праца» [10]:

**Мая праца**

Да золку ўстаю,
Працаваць пачынаю
І кожнаму слову
Іспыт учыняю:

Ці добра на вобраз,
На голас ці тонка,
Бо што як на вока
Патрапіць патомку!

І гэтак — заўсёды,
І гэтак — да кропкі.
А кропку мне ў спадкі
Узычылі продкі.

*Максім Лужанін.*

— Якое значэнне ў жыцці Максіма Лужаніна мае праца?

Пры выкананні задання 2 для дадатковай візуалізацыі варта прапанаваць разгледзець лагатыпы пералічаных беларускіх прадпрыемстваў, звярнуць увагу на выкарыстаную сімволіку і колеравыя прыярытэты.

Дадатковым заданнем можа стаць наступнае:

1. Падрыхтуйце інфармацыйны тэкст пра высокаякасную мясцовую прадукцыю. Запоўніце табліцу (табл. 8).

*Табліца 8*

**Зроблена ў Беларусі**

| Назва прадукту | |
|---|---|
| Як даўно на айчынным рынку? | |
| Ці вядомы на сусветным рынку? | |
| Дзе выпускаецца прадукт? | |
| Дзе і як выкарыстоўваецца? | |
| Якімі ўзнагародамі адзначаны? | |

2. Прывядзіце прыклады, якія даказваюць, што беларускія прамысловыя і прадуктовыя тавары карыстаюцца попытам у розных краінах свету.

3. Якую інфармацыю можна атрымаць пры наяўнасці на прадукцыі спецыяльнага QR-кода *Made in Belarus*?

Спецыяльны QR-код *Made in Belarus* размяшчаецца на ўсіх этыкетках, упакоўках прадукцыі, што ідзе як на экспарт, так і на ўнутраны рынак. З дапамогай QR-кода можна зайсці на сайт вытворцы і пазнаёміцца з поўным апісаннем прадукту.

Рэкамендуецца зрабіць кароткае падагульненне па пытаннях, прапанаваных у дыдактычных матэрыялах.

**II. Збор інфармацыі пра аб’екты прамысловасці мясцовасці** (2 гадзіны).

На дадзеным этапе вучні ўдасканаляць уменні пошуку асноўнай і дадатковай інфармацыі ў інтэрнэце, бібліятэках і музеях; апрацоўваць яе ў адпаведнасці з тэмай.

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што ім давядзецца працаваць з дакументамі для атрымання патрэбнай інфармацыі пра гісторыю станаўлення прадпрыемства, а таксама браць інтэрв’ю ў працаўнікоў прадпрыемства.

Збор інфармацыі (заданне 3) па тэме праекта варта размеркаваць паміж вучнямі (групамі вучняў) па наступных напрамках:

1. Гісторыя. Гісторыя будаўніцтва і адкрыцця прамысловага прадпрыемства (гісторыя стварэння сельскагаспадарчага прадпрыемства) вашага рэгіёна.
2. Працаўнікі прадпрыемства (кіраўнікі, штат, працоўныя дынастыі, дошка гонару).
3. Прадукцыя прадпрыемства (паказчыкі вытворчасці, асаблівасці вытворчага і тэхналагічнага працэсаў і іх эвалюцыя, рэалізацыя прадукцыі, спажыўцы).
4. Рознае (сацыяльная работа прадпрыемства, прафсаюзны камітэт).

**III. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: рэкламны буклет «Прамысловае (сельскагаспадарчае) прадпрыемства мясцовасці»** (5 гадзін).

У працэсе выканання задання 4 вучням рэкамендуецца расказаць пра тое, што У. Галубок у 1928 г. стаў першым беларускім народным артыстам. Лагічна задаць пытанне пра тых, каго з народных артыстаў Беларусі яны ведаюць.

Калі У. Галубку прысвоілі гэта ганаровае званне, ён выказаўся так:

«Вось бягу прасіць, каб перабілі на заслужанага. Ты разумееш, я заўсёды ў народзе, сярод простых людзей, а яны скажуць: «Народны артыст? Дык ён жа заўсёды быў, ёсць і будзе народны. Ніякая гэта не заслуга. Вось заслужаны, гэта іншая справа; кожнаму ясна — заслужаны чалавек, тут табе і пашана, і аўтарытэт» *(Паводле Я. Рамановіча «Рэкі цякуць з ручаёў»).*

— Як гэта выказванне характарызуе асобу У. Галубка?

Надзвычай карыснымі стануць матэрыялы «Гасцёўні Уладзіслава Галубка» ў філіяле Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі. У экспазіцыі музея захоўваюцца касцюмы тэатра У. Галубка, а таксама дакументы, мастацкія творы, афішы і шмат іншага. Настаўніку рэкамендуецца арганізаваць экскурсію для вучняў у вышэйадзначаны музей.

Пры разглядані творчай дзейнасці II Беларускай трупы настаўніку рэкамендуецца закрануць культурна-асветніцкую творчую дзейнасць хароў М. Равенскага, У. Тэраўскага, дзейнасць Ф. Ждановіча і інш.

Вучням прапануецца выканаць заданне 5. У парах і групах варта праводзіць абмеркаванне тэксту задання, які адлюстроўвае маральныя якасці людзей, іх працоўныя дасягненні, праблемы і г. д. Аналіз тэксту з пункта гледжання сістэмы маральнага ідэалу накіраваны на пераасэнсаванне ўласных поглядаў вучняў, а таксама на самааналіз свайго ўнутранага свету. На аснове тэксту задання настаўніку рэкамендуецца арганізаваць палеміку па маральных пытаннях. Адным з важных яе кампанентаў з’яўляецца адстойванне ўласнага пункта гледжання з выкарыстаннем аргументаваных доказаў, пошук агульных пазіцый і кампрамісу для ўсведамлення маральных пазіцый і маральных каштоўнасцей іншых вучняў.

Плённым завяршэннем задання можа стаць сустрэча з прадстаўніком працоўнай дынастыі, падчас якой вучні могуць больш падрабязна пазнаёміцца як з цікавай асобай, асаблівасцямі і тайнамі яе прафесіі, так і задаць свае хвалюючыя пытанні.

Падчас выканання задання 6 варта нагадаць вучням абрад «Дажынкі» ў выкананні народных спевакоў, якія захоўваюць яго традыцыю бытавання ў Беларусі. Прыкладам можа паслужыць абрад «Дажынкі» вёскі Бабічы Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці.

Пры выкананні задання 7 рэкамендуецца падзяліцца на групы, кожная з якіх будзе рыхтаваць сваё пытанне для дапаўнення і пашырэння інфармацыі ўсяго задання. Пры жаданні некаторыя пытанні можна прапускаць.

Дадаткова да задання 7 можна прапанаваць пытанні на экалагічную тэму, скіраваныя на аналіз сітуацыі і выпрацоўку ўласнай пазіцыі па пытаннях экалогіі ў рэгіёне:

— Якія экалагічныя праблемы існуюць у вашай мясцовасці ў сувязі з прадпрыемствам?

— Якую шкоду гэтыя экалагічныя праблемы наносяць наваколлю?

— Як вырашыць экалагічныя праблемы?

— Ці згодны вы з выказваннем эколага М. Рэймерса пра тое, што не прыродзе патрэбна наша абарона, а гэта нам неабходна яе заступніцтва: чыстае паветра, каб дыхаць; крыштальная вада, каб піць; уся прырода, каб жыць?

**IV. Праектная дзейнасць** (2 гадзіны).

Падрыхтоўка рэкламнага буклета прадпрыемства мясцовасці. Пры падрыхтоўцы рэкламнага буклета настаўніку варта абмеркаваць з вучнямі наступную інфармацыю:

Буклет складае адзін аркуш фармату А4, які можна складаць рознымі спосабамі. Ён мае невялікі аб’ём і, як правіла, утрымлівае сціслыя і дакладныя звесткі пра прадпрыемства і яго прадукцыю. Буклет карыстаецца асаблівым попытам сярод заказчыкаў паліграфічнай прадукцыі з-за сваёй зручнасці ў распаўсюджванні: яго можна атрымаць на вуліцы або гандлёвым цэнтры, адправіць па пошце або размясціць на спецыяльным рэкламным стэлажы. Ён з’яўляецца важнай часткай маркетынгавай кампаніі любога прадпрыемства. Галоўная мэта рэкламнага буклета — прыцягнуць увагу чытачоў і заахвоціць да дзеяння (патэлефанаваць, купіць і г. д.). У структуру буклета ўваходзіць інфармацыя пра рэкламны аб’ект, даныя пра прадпрыемства і яго кантактная інфармацыя, апісанне спосабаў і ўмоў набыцця прадукцыі.

Для таго каб інфармацыя рэкламнага буклета была больш даступная, пераканаўчая і дайшла да адрасата, неабходна:

- падрыхтаваць тэкст;
- выкладаць інфармацыю з выкарыстаннем графічных інструментаў;
- выкарыстоўваць ілюстратыўны матэрыял; дадатковыя візуальныя інструменты (карты, графікі);
- ужываць фірмавыя колеры, шрыфты і г. д.

Для таго каб з першых радкоў завалодаць увагай кліентаў, важна правільна напісаць тэкст, кіруючыся наступнымі рэкамендацыямі:

1) пісаць простымі, ёмістымі сказамі, не выкарыстоўваючы складаныя тэрміны;

2) структураваць тэкст, выкарыстоўваючы спісы, загалоўкі, падзагалоўкі.

Тэкст павінен уключаць:

- расказ пра карысць прадукцыі для спажыўца з адказамі на пытанні і пярэчанні чытача;
- інфармацыйны блок, у якім выкарыстоўваецца толькі адна галоўная ідэя;
- рэгулярнае ўжыванне назвы прадпрыемства або прадукцыі для большай пазнавальнасці;
- максімальна інфарматыўны заклік да дзеяння («патэлефануй па нумары тэлефона», «запоўні наступную форму», «спампуйце з сайта»), які ўтрымлівае толькі назоўнікі і дзеясловы.

3. выкладаць інфармацыю паслядоўна і лагічна.

4. не дапускаць арфаграфічныя і стылістычныя памылкі.

**V. Прэзентацыя** (1 гадзіна).

Прэзентацыю рэкламнага буклета «Прадпрыемства рэгіёна» (як у электроннай, так і друкаванай версіі) можна правесці ва ўстанове адукацыі з удзелам вучняў, бацькоў, у межах гарадскіх (сельскіх) мерапрыемстваў і г. д.

**VI. Рэфлексія.**

Падчас рэфлексіі настаўнік можа прапанаваць вучням адказаць на пытанні па тэме праекта. Пытанні могуць быць як простымі, каб засяродзіць увагу вучняў на асобных аспектах тэмы, так і праблемнымі. Вучні, калі рыхтуюць адказ на пытанне, маюць магчымасць самастойна прыйсці да высноў і падагульненняў, якія настаўнік мусіць ім выкласці ў якасці новых ведаў. Акрамя таго, вучні яшчэ болей усвядомяць важнасць тэмы праекта, каб дадаткова павялічыць цікавасць і ступень успрыняцця ўсяго матэрыялу, выкарыстанага ў праекце.

Падчас рэфлексіі настаўнік павінен сачыць за тым, каб пытанні не заставаліся без адказу, бо яны будуць насіць рытарычны характар, што не забяспечыць дастатковай актывізацыі мыслення вучняў.

# Модуль 9. На добрай зямлі добрая надзея

***Мэта праекта*** — выхаванне асобы, якая любіць і ганарыцца сваёй Радзімай, здольнай адэкватна ўспрымаць, ацэньваць і прагназаваць асноўныя напрамкі развіцця рэгіёна ў будучым.

**І. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці** (1 гадзіна).

Важна разгледзець пытанні для роздуму над праектам.

Пры абмеркаванні тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці рэкамендуецца заахвочваць вучняў прапаноўваць свае ідэі. Вучням варта паразважаць над тым, што ў сучасным свеце ўсё мяняецца значна хутчэй, чым 10–20 гадоў таму назад, дзякуючы значнаму тэхналагічнаму прагрэсу. Вучням падабаецца фантазіраваць пра будучыню, пра тое, як зменіцца грамадства ў кожнай краіне, якім будзе геапалітычны стан у свеце, якое адзенне будзе модным, якія збудаванні будуць фарміраваць аблічча гарадоў і г. д.

Рэкамендуецца пашырыць кола пытанняў для роздуму сыходзячы з зацікаўленасці вучняў.

Пры выкананні задання 1 настаўніку варта растлумачыць незнаёмае паняцце «футуралогія». ***Футуралогія*** — гэта навука, якая вывучае будучыню, мэты і задачы, напрамкі далейшага развіцця чалавецтва. Футуролагі аналізуюць сённяшнія тэндэнцыі і складаюць максімальна рэалістычны хронапрагноз з улікам усёй магчымай рызыкі.

Мэтазгодна пазнаёміць вучняў з наступнай дадатковай інфармацыяй:

Даследаванні будучыні штодня становяцца больш запатрабаванымі. Кіраўнікі вялікіх кампаній шмат часу аддаюць на вывучэнне магчымых сцэнарыяў будучыні. Прагназаванне будучыні дапамагае калі не пазбегнуць глабальных катастроф для ўсяго чалавецтва, дык хоць падрыхтавацца да іх. Спецыяльнасць футуролага можна атрымаць у Берлінскім свабодным універсітэце, а таксама ў некалькіх амерыканскіх універсітэтах як дадатковыя курсы для базавай адукацыі. Значная большасць паспяховых футуролагаў сёння — гэта фізікі, праграмісты, сістэмныя аналітыкі, матэматыкі — людзі, якія часта маюць больш за адну адукацыю ў галіне дакладных навук.

Варта звярнуць увагу вучняў на тое, што пры падрыхтоўцы праекта яны змогуць асэнсаваць прафесію футуролага.

Правільныя адказы на пытанні задання 1:

А — акіянская спіраль у Японіі;
Б — праект «Чэнду — Вялікі горад» ;
В — праект «Горад будучыні» ў Бразіліі;
Г — праект «Умка».

Для агульнага разумення праблемы будучыні чалавецтва варта пазнаёміцца з футуралагічным прагнозам тэхнічнага дырэктара кампаніі Google Р. Курцвейла, які ў сваіх меркаваннях сягае ў канец XXI стагоддзя. Рэкамендуецца супаставіць палажэнні прагнозу Р. Курцвейла з уласнымі меркаваннямі.

Неабходна зрабіць кароткае падагульненне па пытаннях, прапанаваных у дыдактычных матэрыялах.

**ІІ. Збор інфармацыі пра будучыню мясцовасці** (2 гадзіны).

Метад складання кластара (заданне 2) стымулюе пазнавальную дзейнасць вучняў, матывуе іх да разважання.

Кластар можна аформіць у выглядзе гронкі. У цэнтры размяшчаецца асноўнае паняцце, думка, па баках абазначаюцца буйныя сэнсавыя адзінкі, злучаныя з цэнтральным паняццем прамымі лініямі. Гэта могуць быць словы, словазлучэнні, прапановы, ідэі, думкі, факты, вобразы, асацыяцыі, якія, пашыраючы лагічныя сувязі, больш поўна раскрываюць тэму.

Пры падрыхтоўцы кластара пажадана, каб сярод асноўных сэнсавых адзінак былі ўключаны пытанні насельніцтва, сям'і, адукацыі, будаўніцтва, транспартных сродкаў, галоўных прадпрыемстваў, прафесій будучыні, клімату, экалогіі, новых тэхналогій, бытавой сферы і інш.

Заданне пажадана выконваць у парах (групах), пасля чаго яго варта абмеркаваць у класе. Менавіта на гэтым этапе рэкамендуецца вызначыцца з напрамкамі дзейнасці чалавека ў 2050 годзе, якім будзе прысвечаны наш праект.

Лагічным завяршэннем работы з кластарам будзе адказ вучняў на пытанне:

— У якой сферы вам цікава было б паспрабаваць свае сілы?

Настаўнік арганізуе пошук інфармацыі па акрэсленых і вызначаных вучнямі напрамках.

Для выканання задання 3 надзвычай карыснымі стануць наступныя матэрыялы:

а) мастацкія фільмы (мал. 10, 11–14, 15–16):



*Мал. 10.* Кадр з фільма «Аднойчы 20 гадоў таму» (1980, рэж. Ю. Ягораў).




*Мал. 11–14.* Кадры з фільма «Госця з будучыні» (1984, рэж. П. Арсёнаў).




*Мал. 15–16.* Кадры з фільма «Асаблівае меркаванне» (2002, рэж. С. Спілберг).

б) мастацкія творы Я. Драздовіча (малюнкі 10–12):



*Мал. 17.* Я. Драздовіч.
Трывеж. Панарама луннага горада



*Мал. 18.* Я. Драздовіч.
Чарцёж міжпланетнай тарпеды



*Мал. 19.* Я. Драздовіч. Горад на Марсе

Акрамя таго, варта прапанаваць для знаёмства з творчасцю Я. Драздовіча відэаматэрыялы, змешчаныя на сайце Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (https://www.nlb.by/content/projects/virtual/udivitelnyy-mir-yazepa-drozdovicha/), а таксама віртуальна наведаць музей беларускай маляванкі (https://zaslaue.by), дзе прадстаўлены работы айчыннага дзеяча.

Дадатковую інфармацыю пра творчасць Я. Драздовіча вучні могуць знайсці ў вучэбным дапаможніку «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» (9 клас).

в) літаратурныя творы беларускага пісьменніка-фантаста У. Шыціка: «Трансплутонавыя афеліі», «Скачок у нішто», «Сустрэча», «Шорахі чужой планеты». У сваёй творчасці ён стварыў вобраз будучыні і прадказаў шэраг прылад і гаджэтаў, якімі мы сёння карыстаемся. Можна прапанаваць вучням прачытаць урыўкі з яго твораў і паспрабаваць уявіць будучыню вачамі пісьменніка. Карысным стане знаёмства з творамі літаратара з мэтай асваення сістэмы каштоўнасных адносін да рэальнасці, людзей, факусіроўкі ўвагі на іх эмацыянальна-пачуццёвым свеце.

Пры пошуку літаратуры, якая адлюстроўвае погляды сучасных футуролагаў свету на будучыню чалавецтва, можна прапанаваць вучням абмежавацца той, якая была надрукавана або змешчана ў інтэрнэце ў апошнія 5 гадоў.

**ІІІ. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: выстава «2050. Рэгіён вачамі дзяцей»** (4 гадзіны).

Заданне 4 выконваецца паступова непасрэдна падчас работы над праектам. Настаўнік можа выбраць з іх заданні па ўласным меркаванні. Інфармацыяй для роздуму могуць стаць наступныя факты:

1. Доля насельніцтва Беларусі ад агульнай колькасці насельніцтва планеты складае 0,13 %. Такую ж долю па колькасці насельніцтва маюць Швецыя і Азербайджан.

2. Прыкладна 70 % насельніцтва свету будуць жыць у гарадах або ўрбаністычных тэрыторыях у 2050 годзе, на сённяшні дзень гэты паказчык складае 49 %.

Дадаткова прапануецца адказаць на пытанне:

— Як змянілася колькасць насельніцтва вашага рэгіёна пасля вайны? Складзіце графік колькасці насельніцтва ў перыяд 1940–1950 гг.

Паведамленне задання 5 можна прапанаваць падрыхтаваць і правесці ў выглядзе калектыўнай прэзентацыі. У такім выпадку мэтазгодна падзяліць пытанні для падрыхтоўкі і дэманстрацыі паміж групамі.

Правільныя адказы на пытанні задання 6 (табл. 9):

*Табліца 9*

| | |
|---|---|
| **Анлайн-тэрапеўт** | доктар, які вядзе папярэднюю дыягностыку пацыента, каб выявіць яго хваробу і адправіць да вузкага спецыяліста, а таксама праводзіць анлайн-кансультацыі падчас тэрапіі |
| **Эксперт па вобразе будучыні вучня** | дапамагае вучням сфарміраваць персанальныя траекторыі развіцця, падбірае курсы, гурткі і секцыі суразмерна іх інтарэсам і здольнасцям |
| **Экааўдытар** | незалежны эксперт, які правярае экалагічнасць прадпрыемства і іншыя аб’екты інфраструктуры |
| **Гід у сферы касмічнага турызму** | спецыяліст па распрацоўцы і падборы праграм у космас, суправаджае турыстаў падчас падарожжа, праводзіць экскурсіі |
| **Архітэктар зялёных гарадоў** | спецыяліст, які праектуе будынкі, кварталы і гарады з улікам экалагічных патрабаванняў і прынцыпаў устойлівага развіцця |
| **Трэндвотчар** | спецыяліст, які вывучае змены ў эканоміцы, палітыцы, навуцы, культуры і грамадскім жыцці, а затым на аснове іх аналізу рыхтуе для бізнесу стратэгічныя рэкамендацыі |
| **Дата-журналіст** | спецыяліст, які аналізуе і збірае даныя, каб затым на іх аснове рыхтаваць артыкулы, нататкі і іншыя фарматы журналісцкіх матэрыялаў, уключаючы таксама інтэрактыўны |

| | |
|---|---|
| **Лічбавы лінгвіст** | спецыяліст па апрацоўцы даных на мовах, які стварае інструменты распазнавання тэксту і мовы, сістэм перакладу, галасавых асістэнтаў, разумных чат-ботаў |
| **Капірайтар** | спецыяліст, які стварае тэкставы кантэнт |

Заданні 7–8 выконваюцца паступова непасрэдна падчас работы над праектам. Дадатковае заданне можа ахапіць любую сферу дзейнасці чалавека, якая можа зацікавіць вучняў. Напрыклад, заданне на транспартныя сродкі:

— Якія віды транспарту распаўсюджаны ў Рэспубліцы Беларусь? Дапоўніце спіс транспартных сродкаў Беларусі:
чыгуначны;
аўтамабільны;
гарадскі электрычны (трамвай, тралейбус, электробус) і метрапалітэн;
паветраны;
водны;
…
— Якія з транспартных сродкаў прадстаўлены ў вашым рэгіёне? Якія транспартныя сродкі з іх захаваюцца, а якія не? Абгрунтуйце свой адказ.

Падобным чынам могуць будавацца заданні пра вывучэнне медыцыны, флоры і фаўны мясцовасці, спажывецкіх тавараў, гастранамію, індустрыю моды і інш.

**IV. Праектная дзейнасць** (1 гадзіна).

Пры падрыхтоўцы выставы «2050. Рэгіён вачамі дзяцей» неабходна ўлічваць асноўныя этапы яе арганізацыі. Першачарговай задачай з’яўляецца складанне тэматыка-экспазіцыйнага плана, які дазволіць максімальна змястоўна і арганізацыйна падрыхтаваць выставу. На дадзеным этапе важна вылучыць яе кампазіцыйны цэнтр, вызначыць прынцып і месца размяшчэння экспанатаў. Рэкамендуецца падабраць музычнае суправаджэнне выставы, падрыхтаваць каталог экспанатаў выставы і іншую дадатковую інфармацыю.

Пры фарміраванні экспазіцыі кожная работа (экспанат) павінна мець завершанасць выгляду і неабходнае афармленне. Афармленне ўключае каментарый з указаннем назвы работы, імя і прозвішча яе аўтара, яго ўзрост, установу адукацыі, прозвішча і ініцыялы педагога, а таксама паспарту́, фон, інфармацыйныя, літаратурныя і іншыя дадаткі.

**V. Прэзентацыя** (1 гадзіна).

Месцам арганізацыі выставы можа стаць як вучэбны кабінет або калідор, так і актавая зала або хол першага паверха ўстановы адукацыі. Самі ж экспанаты могуць размяшчацца ў выставачных вітрынах, на стэндах, у шафах і на сталах. Надзвычай важным этапам правядзення выставы з’яўляецца яе адкрыццё. Пры гэтым рэкамендуецца падрыхтаваць уступнае слова, прэзентацыю выставы, а таксама экскурсію.

Варта арганізаваць кнігу водгукаў, у якой кожны можа пакінуць свае ўражанні ад выставы, прапановы па яе паляпшэнні, свае ідэі і г. д. Цікавым этапам выставы будзе галасаванне на прыз глядацкіх сімпатый і вылучэнне самай цікавай работы. У арганізацыі выставы могуць быць задзейнічаны творчыя калектывы ўстановы адукацыі з музычна-тэатральнымі нумарамі па тэматыцы экспазіцыі.

**VI. Рэфлексія.**

Пры правядзенні рэфлексіі настаўніку варта выкарыстаць метад «мікрафон». Згодна з ім вучні сядаюць па крузе, па якім перадаецца мікрафон (або іншы прадмет,

які замяшчае яго). Выказацца можа толькі той, хто трымае мікрафон у руцэ. Калі вучню перадалі мікрафон, а яму няма чаго сказаць, ён перадае мікрафон свайму суседу.

Важна, каб вучні выказаліся пра пачуцці, якія яны адчулі ў ходзе ўсяго факультатыўнага курса «Шчаслівы беларусам звацца», а затым пра тое, чаму ён іх навучыў і якія думкі ў іх узніклі падчас падрыхтоўкі праектаў. Надзвычай важна, каб былі абмеркаваны ўсе пачуцці і думкі вучняў. А для таго каб вучні адчулі каштоўнасць свайго ўласнага досведу, важна не дапускаць у класе дыскусію.

Падагульняльную функцыю факультатыўных заняткаў «Шчаслівы беларусам звацца» можа ўзяць на сябе верш вучня 7 класа Пачапаўскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна Іллі Таўстыкі «Быць чалавекам на зямлі», натхнёны радкамі твора Р. Барадуліна «Зямля бацькоў» [19]. У ім у эмацыянальным ключы вылучаны тыя маральна-каштоўнасныя якасці, выхаванне і культываванне якіх вядзе да асобаснай рэалізацыі вучняў: прыгажосці іх духоўнага аблічча, патрыятычнай шчырасці і вернасці беларускай зямлі і народу:

**Быць чалавекам на зямлі**

«Быць чалавекам на зямлі
Зямля бацькоў
Дала мне права».
І гэта, думаю, нялёгкая ёсць справа,
Бо чалавек — ён гаспадар,
А не прышэлец і не госць...
І гэта лепшае, што ў Сусвеце ёсць:
Быць чалавекам на сваёй зямлі,
А значыць, абараняць яе,
Дзе яшчэ прашчуры жылі.
Дзе мова родная гучыць,
Дзе з роднаю прыродай
Нам па-суседску жыць.
Дзе стужкі рэк і ніткі палявых дарог
Вялі да слаўных перамог.
Ведаць і помніць усе гістарычныя падзеі,
Не страціць сумленне, не страціць надзеі,
Не здрадзіць самому сабе.
З радасцю жыць і тварыць дабро,
Любіць усё прыгожае і ненавідзець зло.
Расці, квітнець, удасканальвацца,
Каб чалавекам быць і звацца,
І чалавекам назаўжды застацца.
Жыць для людзей, любіць — вось мэта!
І калі я буду памятаць пра гэта,
То чалавек я і гэтым ганаруся!
І шчаслівы тым, што сын я Беларусі!

*І. Таўстыка.*

# Спіс выкарыстаных крыніц


1. Беларускія народныя строі : альбом / М. Раманюк. — Мінск : Д. Раманюк, 2003. — 77 с.

2. Ветрова, С. А. Повышение качества образования через формирование универсальных учебных действий учащихся : практ. пособие / С. А. Ветрова, М. М. Дударева. — Могилев : МГОИРО, 2020. — 42 с.

3. Ельскі, А. Выбранае : пер. з пол. / А. Ельскі. — Мінск : Беларускі. кнігазбор, 2004. — 493 с., [4] л. іл. — (Беларускі кнігазбор. Серыя 2, Гісторыка-літаратурныя помнікі).

4. Жабінская, М. П. Складзі ўзор сам: народны арнамент у побыце / М. П. Жабінская. — Мінск : Полымя, 1992. — 218 с.

5. Караткевіч, У. С. Зямля пад белымі крыламі / У. Караткевіч. — Мінск : Народная асвета, 1992. — 191 с.

6. Кацар, М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар. — 4-е выд. — Мінск : Беларусь, 2023. — 223 с.

7. Козел, В. И. Проектная деятельность для начинающих: равный обучает равного : практическое руководство / В. И. Козел, Е. А. Клещёва, А. Р. Дыкман. — Барановичи : БарГУ, 2022. — 65 с.

8. Колас, Якуб. Збор твораў / Якуб Колас (Тарас Гушча). — Менск : Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1928. — С. 91.

9. Лексічны атлас беларускіх народных гаворак : у 5 т. / Акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. — Мінск : Фонд фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь, Камітэт геадэзіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, 1993—1998.

10. Лужанін, Максім. Збор твораў : у 4 т. / Максім Лужанін. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1979—1981. — Т. 3. — С. 117.

11. Организация проектной и исследовательской деятельности учащихся : материалы науч.-практ. конф. с междунар. участием, 20–22 апр. 2022 г. / редкол. : И. П. Кондратьева [и др.]. — Минск : Минский областной институт развития образования, 2022. — 253 с.

12. Проектная деятельность. Организация успешных мероприятий / сост. И. А. Подило, А. В. Луговская. — Минск : Белорусский национальный технический университет, 2018. — 35 с.

13. Рамановіч, Я. Рэкі цякуць з ручаёў: аб гісторыі станаўлення беларускага тэатра / Я. Рамановіч. — Мінск : Беларусь, 1969. — 172 с.

14. Свиридов, А. Н. Социально-педагогическое проектирование: учеб. пособие / А. Н. Свиридов, Е. А. Шаталова, П. А. Шептенко. — Москва : Флинта, 2018. — 148 с. — (Педагогика).

15. Сіпакоў, Я. Зялёны лісток на планеце Зямля : эсэ / Я. Сіпакоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. — 277 с. — (Бібліятэка выбраных твораў).

16. Скурат, К. У. Даўнія беларускія меры: лексічны аналіз / К. У. Скурат. — Мінск : Навука і тэхніка, 1974. — 190 с.

17. Создание и деятельность краеведческого клуба : практ. пособие / Главное управление по образованию Могилевского областного исполнительного комитета, Могилевский государственный областной институт развития образования. — Могилев : МГОИРО, 2020. — 26 с.

18. Таран, Р. И. Инновационный проект в школе: теоретические основы и опыт реализации / Р. И. Таран, Д. Ч. Покачайло. — Гродно : ГрГУ, 2020. — 169 с.

19. Таўстыка, І. Быць чалавекам на зямлі [Электронны рэсурс] / І. Таўстыка. — Рэжым доступу : https://www.nlb.by/content/news/national-library-of-belarus/byt-chelovekom-na-zemle-osmyslenie-tvorchestva-rygora-borodulina/. — Дата доступу : 11.10.2023.

20. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агульнае рэдагаванне Т. Б. Варфаламеева. — Мінск : Вышэйшая школа, 2001—2013.

21. Холеў, С. Б. Да родных вытокаў : у дапамогу краязнаўцу / С. Б. Холеў. — Мінск : Народная асвета, 2019. — 159 с.

22. Шур, В. Беларускія ўласныя імёны: Беларуская антрапаніміка і тапаніміка : дапам. для настаўнікаў / В. Шур. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1998. — 237 с.

## Спіс малюнкаў

Мал. 1. А. Кашкурэвіч. Партрэт Фёдара К. [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://polotsk.museum.by/node/35336. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 2. Г. Вашчанка. Маці [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://museum.by/node/57981. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 3. В. Грамыка. Слова пра высакародную старасць [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://hvali.by/belorusskie-hudozhniki/viktor-gromyiko/. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 4. М. Савіцкі. Янка Купала [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://artmuseum.by/ru/online/en-kupala. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 5. А. Ісачоў. Аўтапартрэт [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://www.sb.by/articles/mir-kisti-i-palitry-9-znamenitykh-kartin-belorusskikh-khudozhnikov-.html. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 7. Куфры Беларусі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://etna.by/exhibitions/vystavki-na-territorii/vystava-kufry-belarus.html. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 9. Ласіныя губы па-паляўнічы [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://stale.ru/chanterelles/grib-losinaya-guba-recept-prigotovleniya-guby-losya/. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 10. Кадр з фільма «Аднойчы 20 гадоў таму» (1980, рэж. Ю. Ягораў) [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://www.youtube.com/watch?v=2lvgauEmdMg. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 11–14. Кадры з фільма «Госця з будучыні» (1984, рэж. П. Арсёнаў) [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://www.youtube.com/results?search_query=%D0%B3%D0%BE%D1%81%D1%82%D1%8C%D1%8F+%D0%B8%D0%B7+%D0%B1%D1%83%D0%B4%D1%83%D1%89%D0%B5%D0%B3%D0%BE. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 15–16. Кадры з фільма «Асаблівае меркаванне» (2002, рэж. С. Спілберг) [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://www.youtube.com/watch?v=MsetiYR73pY. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 17. Я. Драздовіч. Трывеж. Панарама луннага горада. — Рэжым доступу : https://hvali.by/belorusskie-hudozhniki/yazep-drozdovich/ [Электронны рэсурс]. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 18. Я. Драздовіч. Чарцёж міжпланетнай тарпеды [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://myland.by/myane-yashche-pashukayuc-kosmologicheskie-vzglyady-yazepa-drozdovicha. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 19. Я. Драздовіч. Горад на Марсе [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://hvali.by/belorusskie-hudozhniki/yazep-drozdovich/. — Дата доступу : 11.10.2023.